Сямейная газета



«Свякроў сваю я звала мамачкай…»

**Увага: сёння прамая лінія!**

**Газета «Звязда» праводзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?**

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Забеспячэнне ўласнымі лекамі — важнае пытанне нацыянальнай бяспекі. Прычым гэта ў адзін дзень не робіцца, неабходны адпаведная школа, кадры, вытворчая база. Прыярытэту ўласнай лекавай вытворчасці ў краіне ўдзяляецца павышаная ўвага. У прыватнасці, на новым беларуска-індыйскім фармпрадпрыемстве, якое ствараецца ў Скідзелі, мы плануем наладзіць выпуск прэпаратаў, звязаных з транспланталогіяй, барацьбой з ВІЧ. Раней падобныя лекі завозіліся з-за мяжы, мы ж імкнёмся да імпартазамяшчэння. Прэпараты плануецца пастаўляць на тэрыторыю ўсяго Мытнага саюза. Чакаецца, што іх кошт у параўнанні з імпартнымі аналагамі будзе ніжэйшы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 2,0039 ▲ |
| Еўра | 2,3764 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0741 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №231 (28595)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# І СЯБРЫ, І ПАРТНЁРЫ

## Прэзідэнт Казахстана з афіцыйным візітам наведвае нашу краіну

**Сёлета беларуска-казахстанскія кантакты вызначаюцца інтэнсіўнасцю. Лідары абедзвюх краін, Аляксандр ЛУКАШЭНКА і Нурсултан НАЗАРБАЕЎ, сустракаліся ў рамках саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў чэрвені, адбыўся шэраг візітаў найвышэйшых службовых асоб. Наша дзяржава прыняла актыўны ўдзел у міжнароднай выстаўцы «ЭКСПА-2017», якая ў гэтым годзе праходзіла ў Казахстане. Насычанасць дыялогу лепш, чым любыя лічбы, падкрэслівае стратэгічны характар супрацоўніцтва.**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

# НАДЗЕЙНА — ЖАЛЕЗАБЕТОННА!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Міхаіл ЛЯШЧУК і Мікалай АРЦЁМЕНКА — мінскія будаўнікі-арматуршчыкі. Шмат гадоў яны працуюць побач — у адной брыгадзе прадпрыемства «Інсэрвісбуд», разам узводзяць прамысловыя і жыллёва-грамадзянскія збудаванні. Міхаіл Аляксандравіч — ён на фота злева — узначальвае брыгаду з дзесяці вопытных спецыялістаў. «Мы выдатна разумеем, што арматура — гэта аснова будучага будынка, — гаворыць ён. — Нядобрасумленнае выкананне работы арматуршчыкаў ставіць пад удар жыццё і здароўе іншых людзей». Цяпер будаўнікі робяць жалезабетонныя канструкцыі перакрыццяў, сцен і калон шматпавярховага дома ў жылым комплексе на вуліцы Аэрадромнай, штомесяц узводзячы аснову для трох — трох з паловай паверхаў будучага дома.**

■ Цікавы досвед

# «ТЭАТРАЛЬНЫЯ ВЕЧАРЫНЫ» Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ,

## або Як глыбінка можа палепшыць сваё жыццё

**Краснаполле — гарадскі пасёлак, дзе жыве ўсяго некалькі тысяч чалавек. Сюды не вельмі ахвотна едуць інвестары і маладыя спецыялісты, але артысты і рамеснікі, дзякуючы ініцыятыўнасці месцічаў, дэпутатаў і выканаўчай улады, ужо цікавяцца гэтым населеным пунктам. У апошнюю пятніцу лістапада тут адначасова запрацавалі два шыкоўныя праекты — міжрэгіянальны фестываль аматарскіх тэатраў «Тэатральныя вечарыны» ў новым фармаце і першае рэгіянальнае свята-конкурс «Рамесная майстэрня».**

### Ініцыятыва ўзнагароджваецца

Краснапольскі тэатр — самы стары аматарскі тэатр у Беларусі. Налета яму спаўняецца 100 гадоў. Ён неаднаразова станавіўся ўдзельнікам і пераможцам усесаюзных конкурсаў і фестываляў, з 1993 года сам з'яўляецца арганізатарам фестывалю «Тэатральныя вечарыны». Тады на яго адкрыццё прыехалі калектывы розных краін.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# І СЯБРЫ, І ПАРТНЁРЫ

### Тэндэнцыі росту

На яго развіццё значны ўплыў аказвае і сяброўства паміж кіраўнікамі абедзвюх дзяржаў. Як слушна заўважыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пачатку сустрэчы ў вузкім фармаце, беларуская зямля ўжо стала роднай для Прэзідэнта Казахстана. Гэтак жа, як казахстанская — для беларусаў:

— Вы заўсёды душэўна адгукаліся пра наш народ, пра нашу дзяржаву. Вы заўсёды аддаяце даніну павагі беларусам за тое, што яны зрабілі, калі мы жылі ў адной дзяржаве. Зараз мы незалежныя суверэнныя дзяржавы, і наша любоў і павага да казахстанцаў меншымі не сталі. Мы заўсёды рады таму, як развіваецца Казахстан.

Апошнія гады гандлёва-эканамічныя адносіны паміж нашымі краінамі — па аб'ектыўных прычынах — перажывалі спад. Але сёлета назіраецца станоўчая дынаміка.

— Нарэшце мы пачынаем перааддольваць спад у нашых гандлёва-эканамічных адносінах. Думаю, што ваш сённяшні візіт якраз паслужыць таму, каб мы змаглі нарасціць тавараабарот. І ў нас для гэтага ёсць усё. Нашы спецыялісты, члены ўрада, якія тут прысутнічаюць, прапануюць нам варыянты, добрыя напрацоўкі. Калі мы пагодзімся з гэтымі прапановамі, гэта будзе значны крок наперад у стварэнні больш магутнай гандлёва-эканамічнай базы нашых адносін, — адзначыў беларускі лідар.

Нурсултан Назарбаеў канстатаваў, што Беларусь сёння — сапраўдная еўрапейская краіна. Асабліва ён адзначыў развітасць сельскай гаспадаркі: нашы тавары прадаюцца па ўсім свеце. У тым ліку — і на казахстанскіх прылаўках.

### І «лічба», і космас

Як заявіў Аляксандр Лукашэнка на перагаворах з казахстанскім калегам у пашыраным складзе, важным крокам да далейшага ўмацавання двухбаковых адносін стане міждзяржаўны дагавор з Праграмай сацыяльна-эканамічнага супрацоўніцтва да 2026 года. Дакумент быў падпісаны ўчора ў Палацы Незалежнасці.

На думку кіраўніка нашай дзяржавы, найважнейшыя кірункі для ўзаемадзеяння — актывізацыя ўзаемных інвестыцый у вытворчасць і пашырэнне рынкаў збыту прадукцыі і паслуг. А для паспяховай работы на сусветных пляцоўках неабходна ствараць уласныя транснацыянальныя карпарацыі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

— Мы сёння разам з Нурсултанам Абішавічам адобрылі прапановы нашых урадаў па стварэнні такіх карпарацый у сферах ад адукацыі да лагістыкі, — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Стратэгічная задача любой дзяржавы — падтрыманне канкурэнтаздольнасці эканомікі — залежыць ад аператыўнасці ўкаранення найноўшых вытворчых і фінансавых тэхналогій і інструментаў. Абедзве краіны ідуць у нагу з часам.

Эпоха «лічбавай будучыні» імкліва наступае, і нашай краіне тут ёсць што прапанаваць партнёрам з Казахстана. За кароткі прамежак часу айчынныя праграмісты забяспечылі якасны рывок краіны ў IT-сферы і выйшлі на глабальны ўзровень. Прадстаўнікі Казахстана ўжо пабывалі ў Парку высокіх тэхналогій і змаглі пазнаёміцца з беларускім праграмным забеспячэннем.

Гатова наша краіна супрацоўнічаць і ў касмічнай сферы:

— Мы недастаткова выкарыстоўваем патэнцыял навукова-тэхнічных сувязяў, — мяркуе Аляксандр Лукашэнка. — Лічу важным развіццё партнёрства з Казахстанам у касмічнай сферы, напрыклад, па такіх кірунках, як дыстанцыйнае зандзіраванне Зямлі, навукова-касмічныя даследаванні, касмічная сувязь.

Можам мы прапанаваць і ўласныя інавацыйныя дасягненні ў аграрнай галіне.

### Пераход на новы ўзровень

У той жа час рухавіком двухбаковага эканамічнага супрацоўніцтва застаецца прамысловая кааперацыя. Пры належнай падтрымцы з боку абедзвюх дзяржаў можна павысіць эфектыўнасць беларуска-казахстанскіх вытворчасцяў камунальнай і пасажырскай тэхнікі МАЗ, сельскагаспадарчых машын.

Транзітнае супрацоўніцтва таксама абмяркоўвалася на сустрэчы лідараў. Беларусь збіраецца і надалей заставацца надзейным транзітным партнёрам Казахстана, адзначыў кіраўнік нашай краіны:

— Нашы кампаніі, прадпрыемствы ўжо маюць станоўчы вопыт у галіне жыллёвага і дарожнага будаўніцтва ў Казахстане. Выхаду на новы ўзровень супрацоўніцтва ў гэтых сферах будзе садзейнічаць узаемнае прызнанне адміністрацыйных працэдур допуску арганізацый на рынак праектных і будаўнічых работ у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. На думку Прэзідэнта нашай дзяржавы, неабходна актывізаваць дыялог дзяржаў ЕАЭС для больш хуткай выпрацоўкі рашэння па дадзеным пытанні.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што нашы краіны па праве могуць ганарыцца вынікамі ўзаемадзеяння ў гуманітарнай сферы. Гэта і навука, і адукацыя, і ахова здароўя, і культура, і сродкі масавай інфармацыі...

### Рэзервы ёсць

Цяперашні візіт казахстанскага лідара ў Мінск — сімвалічны. Сёлета спаўняецца 25 гадоў з дня ўсталявання дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. Па выніках перагавораў з Нурсултанам Назарбаевым кіраўнік нашай дзяржавы сказаў журналістам, што за гэты час мы сталі не проста сябрамі, але і сур'ёзнымі партнёрамі. Развіваючы наша супрацоўніцтва, мы павінны арыентавацца на паказчыкі 2014 года, калі аб'ём узаемнага гандлю перавысіў мільярд долараў. Гэта задача — выканальная. Істотны ўнёсак тут можа зрабіць супрацоўніцтва нашых краін у плане імпартазамяшчэння:

— Я абсалютна падтрымліваю яго (Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева. — **Аўт.**) прапанову прааналізаваць канкрэтныя групы тавараў, паглядзець, адкуль ідзе ў Казахстан, Беларусь імпарт, ці зможам мы замясціць гэты імпарт у дзвюх краінах.

Беларуска-казахстанскі бізнес-форум, які ўчора праходзіў у Мінску, таксама павінен паспрыяць вырашэнню гэтай задачы, аказаць станоўчы ўплыў і на лічбавыя паказчыкі нашых адносін, і на кантакты. Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што гэта мерапрыемства дапаможа знайсці новыя кірункі для супрацоўніцтва.

Нурсултан Назарбаеў дадаў, што паміж Беларуссю і Казахстанам створана велізарная дагаворная база і наша партнёрства будзе пашыраца — у інтарэсах абедзвюх дзяржаў і народаў. Дарэчы, учора, акрамя названага Дагавора аб сацыяльна-эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Казахстана да 2026 года, былі падпісаны дакументы па супрацоўніцтве ў сферах вытворчай і навукова-тэхнічнай кааперацыі абаронных галін прамысловасці; сродкаў масавай інфармацыі; навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва акадэмій навук дзвюх дзяржаў; спорту, культуры і міжнародных адносін.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Еўрапейскія гульні ў Беларусі стануць найлепшымі ў гісторыі

**Беларусь забяспечыць падрыхтоўку да II Еўрапейскіх гульняў 2019 года на самым высокім узроўні. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора падчас сустрэчы з прэзідэнтам Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янезам Качыянчычам, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

«Вы павінны ведаць, што ў Беларусі ў вас моцны пункт апоры. Вы заўсёды можаце разлічваць на нашу краіну. Тым больш напярэдадзе ў нас такая вялікая, знакавая падзея (II Еўрапейскія гульні 2019 года), і нам трэба будзе вельмі шмат зрабіць, — сказаў кіраўнік краіны. — Нашы прадстаўнікі зусім нядаўна паведамлялі аб сітуацыі, звязанай з падрыхтоўкай да II Еўрапейскім гульняў. Хачу вас запэўніць, што ўсё, што мы паабяцалі, да сярэдзіны 2019 года будзе мадэрнізавана, пабудавана і апрабавана. І вы не будзеце мець ніякіх праблем ні з гасцямі — іх рассяленнем, харчаваннем, — ні са спартсменамі, трэнерамі, спецыялістамі, функцыянерамі алімпійскіх камітэтаў. Мы зробім гэта, як і ўласціва Беларусі, вельмі душэўна, адкрыта».

«Гэта будуць найлепшыя Еўрапейскія гульні. Таму што гэтай Алімпіядай будзе жыць увесь беларускі народ», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Янез Качыянчыч адзначыў, што кіраўнік нашай дзяржавы запрасіў яго ў Беларусь адразу ў дзвюх якасцях — Прэзідэнта краіны і прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта. «Вы адзін з тых лідараў, на якіх трымаецца свет. І калі вы абяцаеце, што ўсё будзе арганізавана добра, значыць, так яно і будзе», — заявіў прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў. «Мы вельмі задаволены тым, як ідзе падрыхтоўка. Мы цалкам укладваемся ў часавы графік. І я ўпэўнены, што Еўрапейскія гульні ў Мінску будуць самымі лепшымі ў гісторыі», — дадаў Янез Качыянчыч.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

### ■ Парламенцкі дзённік

## Спартыўная дзяржава

Амаль кожны чацвёрты беларус рэгулярна займаецца спортам і фізічнымі практыкаваннямі

**Пра гэта паведаміў першы намеснік міністра спорту і турызму Вячаслаў ДУРНОЎ падчас круглага стала на тэму фарміравання здаровага ладу жыцця і прафілактыкі негатыўных з'яў у маладзёжным асяроддзі, які адбыўся ў Палацы прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

— Аналіз статыстычных даных паказвае імкненне беларускіх грамадзян да актыўнага ладу жыцця. Сярэдні паказчык колькасці людзей, якія займаюцца фізічнымі практыкаваннямі і спортам, складае 22,5%, або больш за 2 млн чалавек, — адзначыў Вячаслаў Дурноў. — Гэта і дзеці, і маладыя, і пажылыя людзі, якія наведваюць спартыўныя секцыі, гурткі.

Ён таксама нагадаў, што сёння ў Беларусі налічваецца больш за 23 тысячы фізкультурна-спартыўных збудаванняў, а за апошнія пяць гадоў у краіне ўведзена ў эксплуатацыю больш за 100 аб'ектаў фізкультурна-спартыўнага прызначэння. Загрузка падобных устаноў — на высокім узроўні і складае каля 79% у 2017 годзе, што больш, чым у 2016-м.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК** лічыць, што сёння ў краіне ёсць аб здаровым ладзе жыцця кажуць сапраўды шмат. «Але апошнім часам адбылося спрашчэнне гэтага паняцця, таму гаварыць толькі пра два яго складнікі: прытрымліванне дыеты і выкананне пэўных фізічных практыкаванняў, — сказала яна. — Аднак гэта захаванне і фізічнага, і псіхічнага здароўя. Здаровы лад жыцця — гэта таксама і маральны дабрабыт».

Дарэчы, зараз у камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы знаходзіцца законапраект аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у закон аб фізічнай культуры і спорце.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## Дні культуры Грузіі пройдуць у 2018 годзе

**Пра гэта паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. Ён адзначыў, што штогадовы фестываль «Тбілісоба» паказвае зацікаўленасць беларусаў да грузінскай культуры.**

Да таго ж у наступным годзе Беларусь прыме ад Грузіі эстафету па правядзенні дзіцячага «Еўрабачання». На сустрэчы з паслом Грузіі ў Беларусі Давідам Катарыя старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу на двухбаковае супрацоўніцтва і падкрэсліў, што па таваразвароце задачы пастаўлены і пабудаваны пэўны фундамент. Да таго ж Уладзімір Андрэйчанка сказаў, што, магчыма, групе сяброўства Беларусь — Грузія не хапае ініцыятывы, таму ёсць сэнс папрацаваць у гэтым кірунку.

За гады работы Давіда Катарыя ў Беларусі шмат чаго было зроблена для двухбаковых адносін. У тым ліку арганізаваны візіты на вышэйшым узроўні. Зараз ён заканчвае сваю дыпламатычную місію. У канцы кастрычніка Міністэрства замежных спраў Грузіі прадставіла кандыдата на гэты пост. Ім стаў Валерый Кварацхелія, які апошнія тры гады працаваў намеснікам міністра працы, аховы здароўя і сацыяльнай абароны Грузіі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by* ■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КНДР заявіла аб завяршэнні стварэння ядзерных сіл

Паўночная Карэя заявіла аб завяршэнні стварэння ўласных ядзерных сіл, перадае РІА «Навіны» са спасылкай на заяву лідара КНДР Кім Чэн Ына.

«Асабіста назіраючы за паспяховым выпрабаваннем МБР «Хвасон-15», таварыш Кім Чэн Ын даў яму высокую ацэнку, сказаўшы, што сёння дасягнуты гістарычныя поспех у завяршэнні ядзернага ўзбраення дзяржавы», — гаворыцца ў паведамленні цэнтральнага тэлебачання КНДР.

Раней паведамлялася, што КНДР заявіла аб паспяховым выпрабаванні ракеты Хвасон-15, здольнай паразіць любую цэль на ўсёй тэрыторыі ЗША.

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін абмеркавалі па тэлефоне магчымы адказ на тэст міжкантынентальнай балістычнай ракеты КНДР. Пра гэта паведамляе прэс-служба Белага дома. «Абодва лідары падкрэслілі сур'ёзную пагрозу, якую КНДР уяўляе не толькі для ЗША і Рэспублікі Карэя, але і для ўсяго свету», — гаворыцца ў паведамленні.

### Нявеста прынца Гары пакідае серыял, які прынёс ёй славу

Амерыканская актрыса Меган Маркл пакідае серыял «Форс-мажор», які прынёс ёй славу, пасля сваіх заручын з брытанскім прынцам Гары. Пра гэта паведамляе Reuters са спасылкай на USA Network і Universal Cable Productions.



Артыстка завяршыла здымкі ў сёмым сезоне, які вернецца ў эфір у пачатку 2018 года. У гэтым тэлешоу Маркл выконвае ролю нявесты аднаго з галоўных герояў.

У сваёй сумеснай заяве абедзве кампаніі павіншавалі актрысу і прынца з нагоды іх заручын. «Меган з'явілася членам нашай сям'і сем гадоў, і праца з ёй была радасцю. Мы хочам падзякаваць ёй за бясспрэчную страсць і адданасць «Форс-мажору» і жадаем ёй усяго самага лепшага», — адзначаецца ў заяве.

Нявеста брытанскага прынца Гары Меган Маркл не атрымае тытул прынцэсы пасля вяселля. Паводле пратакола брытанскай каралеўскай сям'і, у амерыканскай актрысы «не хапае каралеўскай крыві» для тытула, з чым у свой час сутыкнулася і жонка брата Гары прынца Уільяма — Кейт Мідлтан.

У 2011 годзе пасля вяселля Кейт атрымала тытул «яе каралеўскай міласці, прынцэсы Уільяма Уэльскага». Хутчэй за ўсё, такі ж лёс чакае і Меган Маркл.

### Цана свабоды — $1 млрд

За вызваленне былога міністра нацыянальнай гвардыі Саудаўскай Аравіі прынца Мутаіба бен Абдалы бен Абдэля-Азіза Аль Сауда, адпушчанага на свабоду пасля трохтыднёвага знаходжання пад вартай па падазрэнні ў карупцыйных злачынствах, заплацілі больш за 1 млрд долараў, паведамляе агенцтва Reuters са спасылкай на чыноўніка ў Саудаўскай Аравіі.

Па словах крыніцы агенцтва, акрамя 65-гадовага прынца, які з'яўляецца адным з 34 дзяцей памерлага ў 2015 годзе караля Саудаўскай Аравіі Абдалы ібн Абдул-Азіз Аль Сауда і які лічыцца адным з галоўных прэтэндэнтаў на карону, яшчэ тры чалавекі былі адпушчаныя на свабоду пасля дасягнення прымальнага пагаднення з урадам.

Раней паведамлялася, што з прынца па рашэнні мясцовых улад былі зняты абвінавачванні ў растраце, махлярстве пры працаўладкаванні і выдзяленні кантрактаў уласным кампаніям.

Да нядаўняга часу прынц Мутаіб узначальваў элітныя часці нацыянальнай гвардыі, аднак 4 лістапада ўказам манарха быў адпраўлены ў адстаўку. Даўні наследны прынц Мухамед бен Салман Аль Сауд заявіў, што большасць з падазраваных у карупцыі пагадзіліся на дасудовае ўрэгуляванне з нацыяналізацыяй часткі іх багацця. У выніку казна атрымала 100 млрд долараў.

■ На кантролі

# ШТО Ў ТАЛЕРЦЫ ВУЧНЯ

**З пачатку навучальнага года ў Гродзенскай вобласці за парушэнні ў сферы школьнага харчавання санітарнымі службамі складзена 246 пратаколаў. Выяўлены факты пратэрмінаваных прадуктаў, заніжанага выхаду гатовых страў, парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага рэжыму. Вострую праблему абмеркавалі на калегіі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці.**

З пачатку навучальнага года праверана большасць сярэдніх навучальных устаноў вобласці. Сярод небяспечных фактараў у школьным харчаванні санітарныя службы называюць прадукты са скончаным тэрмінам прыдатнасці, якіх было канфіскавана агульнай вагой каля 80 кг. У гэты спіс трапілі агуркі, немаркіраваныя каўбаса і сыр, сухары паніровачныя, яблыкі, памідоры, крупы.



Брудныя і мокрыя шклянкі ва ўстанове адукацыі ў пасёлку Краснасельскі Ваўкавыскага раёна.

Па словах **галоўнага ўрача Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Мікалая КЕНДЫША**, недабраякасных прадуктаў адбіраецца менш, чым раней. Але сам факт іх наяўнасці наводзіць на думку, што гэта праблема застаецца даволі вострай. Таму і меры прымаюцца жорсткія. За дадзеныя парушэнні складзена 19 прадпісанняў з адміністрацыйным спагнаннем.

Далёка не ўсюды выконваецца санітарна-эпідэміялагічны рэжым — з ім звязана палова парушэнняў. Гэта і мыццё посуду, і прыборка памяшканняў, і асабістая гігіена. **Начальнік упраўлення КДК Наталля ЖУР** прыводзіць такія абуральныя факты праверкі: мутныя шклянкі, мокры посуд, талеркі з адбітымі краямі. На сцелажах побач з чыстым посудам стаіць і брудны, які пасля прыёму стравы не спяшаліся мыць. Калі б унутраны кантроль праводзіўся па-сапраўднаму, а не фармальна, такіх парушэнняў магло і не быць, канстатуе рэвізор. Як і наяўнасці бактэрыі кішачнай палачкі, якая выяўлена ў 13 пробах гатовай прадукцыі.

Таксама Наталля Жур звярнула ўвагу на бедны асартымент некаторых школьных буфетаў — далёка не ўсюды можна набыць садавіну, бутэрброды, гарачую гарбату. У адной са школ прысутнічаў на вітрыне шакалад з алкаголем у складзе, іншыя пачастункі, продаж якіх у школе забаронены. Зафіксаваны праверкай і факт крадзяжу ў адной са школ Ваўкавыскага раёна, калі прадукты былі падрыхтаваны на вынас.





Захоўванне тавараў пры тэмпературы 18 градусаў цяпла.

У адной з лідскіх школ на момант праверкі на харчаблоку стаяла лужа, якая ўтварылася з-за прарыву водаправоднай трубы.

Яшчэ не ўсюды выкаранена практыка закупкі прадуктаў праз пасярэднікаў. У выніку кошт агародніны абыходзіўся камбінату школьнага харчавання амаль удвая даражэй. Гэта датычыцца і паставак цукру. У некаторых выпадках надбаўка дасягала 230%, што вяло да падаражання гатовых страў. А порцыі, у сваю чаргу, памяншаліся. Напрыклад, замест 100 г мяса клалася толькі 50. Частковая такая сітуацыя звязана з выкананнем грашовых нормаў. Але нельга скідаць з разліку і чалавечы фактар, зазначылі спецыялісты дзяржкантролю.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

## Не ўсе стравы аднолькава карысныя

**Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

— Галоўнай фігурай у арганізацыі харчавання школьнікаў з'яўляецца дырэктар навучальнай установы. Менавіта ён кантралюе і якасць прадуктаў, і парцыённыя нормы, і парадак на харчаблоку. У школе можа не быць еўрарамонту, але там павінна быць чыста і бяспечна. Праведзена значная работа па падрыхтоўцы школ да новага навучальнага года, вышукваліся сродкі на новае абсталяванне кухань і сталовых. Пытанне харчавання школьнікаў было канструктыўна разгледжана на міжведамасным савеце, распрацаваны алгарытм дзеяння для ўсіх катэгорый работнікаў. У большасці выпадкаў не патрэбны фінансавыя затраты, каб выправіць сітуацыю.

**Аляксандр САНГІН, начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама:**

— Тыя, хто корміць дзяцей, павінны перагледзець сваё стаўленне да працы. Толькі падчас узаемных праверак паміж раёнамі каля 600 чалавек прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Тут у першую чаргу спрацоўвае чалавечы фактар, таму што ўсіх рэгламентуючых дакументаў хапае. Мы пачалі ратацыю кадраў. За неналежнае выкананне сваіх абавязкаў у сферы арганізацыі харчавання шэраг службовых асоб прыцягнуты да адказнасці, адзін з кіраўнікоў школ Лідскага раёна зняты са сваёй пасады.

■ Праблема

# Чаму маўчаць жанчыны?

## Трое з чатырох беларусаў зведалі дамашні гвалт

**Псіхалагічны, эканамічны, сексуальны, фізічны — у гвалту шмат твараў. Апытанні, праведзеныя па гэтай тэме ў 2008 і 2014 гадах, паказваюць, што з 14 да 25 працэнтаў вырас працэнт мужчын, якія допускаюць у дачыненні да партнёра-жанчыны такую праяву эканамічнага гвалту, як адмова ў грашах на набыццё жыццёва неабходных рэчаў. З 8 да 18 працэнтаў вырасла і колькасць мужчын, якія лічаць дапушчальным сексуальны гвалт — прымушэнне да палавой сувязі.**

Праблема гвалту лічыцца настолькі сур'ёзнай ва ўсім свеце, што, бадай, кожная краіна не спыняе спробы адшукаць спосабы яе выкарчоўвання. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Швецыя ў Рэспубліцы Беларусь Крысціна Юханесан кажа, што ў Швецыі назіраецца хоць і нязначны, але рост выпадкаў прычынення пашкоджанняў жанчынам. З пачатку года ўрад гэтай краіны прыняў нацыянальную стратэгію па барацьбе з гвалтам у дачыненні да жанчын і дзяцей. Увогуле, на гендарныя пытанні дзяржава зараз выдаткоўвае значныя сродкі.

У Беларусі пакуль няма закона аб прафілактыцы гвалту ў сям'і, яго падрыхтоўка працягваецца, як і інфармацыйная кампанія па фарміраванні нулявой талерантнасці да гвалту ў сям'і і павышэнні ведаў аб паслугах, даступных пацярпелым. Што да паслуг, то кожны чалавек, незалежна ад узросту і полу, павінен запомніць крыніцы дапамогі. **Гэта тэлефонны нумар органаў унутраных спраў — 102, кругласутачная агульнанацыянальная лінія для пацярпелых ад гвалту ў сям'і 8 801 108 8 801** (за 5 гадоў работы сюды дазваніліся 10 тысяч чалавек, у абсалютнай большасці выпадкаў ад гвалту пацярпелі жанчыны) **і сайт ostanovinasilie.org.** Інфармацыйная кампанія атрымала назву «Не маўчы! Спыні гвалт у сям'і!». Яна рэалізуецца Фондам ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) пры міжнароднай тэхнічнай падтрымцы і фінансавай падтрымцы ўрада Вялікабрытаніі.

Калі вы абанент «Мабільных ТэлеСістэм», то ў хуткім часе атрымаеце рассылку з нумарам агульнанацыянальнай гарачай лініі. Баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск» вырашыў правесці 6 снежня тэматычны матч, прысвечаны процідзеянню гвалту ў дачыненні да жанчын і дзяўчатак. Кандытарская фабрыка «Слодыч» і гандлёвая сетка «Белмаркет» выдзяляюць для размяшчэння інфармацыі гардэробныя шафы і камеры захоўвання. Грамадскія аб'яднанні «Гендарныя перспектывы», «Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын», «Радзіслава» нагадваюць аб гатоўнасці падтрымаць усіх, хто да іх будзе звяртацца.

— Сёлета ў галіне бытавых стасункаў ад рук блізкіх людзей загінулі 96 чалавек, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Раман МЕЛЬНІК.** — Мы маем звыш 42 тысяч фактаў прыцягнення вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці. Але гэту лічбу можна смела памнажаць мінімум на 5, паколькі дамашні гвалт — з'ява латэнтная.

Даследаванні паказваюць, што трэць пацярпелых жанчын — гэта тыя, каму ад 27 да 40 гадоў, яны замужам, маюць адно, дваіх або нават траіх непаўналетніх дзяцей, з вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Як правіла, яны не вераць, што ім дапамогуць, ім страшна гаварыць і прасіць аб дапамозе. А тыя, хто становіцца сведкам, разважаюць звычайна на ўзроўні «няёмка ўмешвацца ў чужыя справы», «паклічаш на дапамогу — застанешся ворагам на ўсё жыццё». Таму вобразам інфармацыйнай кампаніі стала маска маўчання.




**Ахвярам гвалту заклікаcontaining дапамагаць у 146 цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе аказваецца комплексная падтрымка розным катэгорыям. Створаны крызісныя цэнтры — іх ужо 128. Працуюць і два прытулкі, дзе жанчына можа знаходзіцца разам з дзецьмі.**

У 2014 годзе ў краіне пачалася работа і з агрэсарамі, у першую чаргу мужчынамі. З'явіліся забароны: на кантакт з ахвярай, на ўстанаўленне яе месцазнаходжання, на сумеснае пражыванне тэрмінам да 30 дзён. На той час у краіне было вынесена каля 200 абарончых прадпісанняў, а сёння іх ужо звыш 4,5 тысячы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## РАССЛЕДАВАННЕ ПА ФАКЦЕ ЗНІКНЕННЯ МАКСІМА ПАДОЎЖАНА

**З-за неабходнасці выканання значнага аб'ёму следчых і іншых працэсуальных дзеянняў тэрмін папярэдняга расследавання па крымінальнай справе, заведзенай па факце знікнення малалетняга жыхара вёскі Новы Двор Свіслацкага раёна Максіма Мархалюка, падоўжаны да чатырох месяцаў. Такая інфармацыя з'явілася на сайце Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.**

«У ходзе высвятлення абставін крымінальнай справы следчымі УСК па Гродзенскай вобласці ва ўзаемадзеянні з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў, органамі мясцовага самакіравання, МНС, Міністэрствам абароны праведзена вялікая праца, накіраваная на ўстанаўленне месцазнаходжання зніклага.

У рамках спецыяльна распрацаваных міжведамасных планаў рэалізуецца комплекс аператыўна-вышуковых і следчых дзеянняў, праводзіцца шэраг экспертных даследаванняў. Працягнуты пошукавыя мерапрыемствы у меркаваным напрамку руху хлопчыка — забалочаная мясцовасці ляснога масіву Нацыянальнага парка «Белавежская пушча». Зніклы абвешчаны ў міжнародны вышук. Старанна аналізуецца і правяраецца любая інфармацыя, у тым ліку якая з'яўляецца ў сродках масавай інфармацыі і інтэрнэце. Адпрацоўваюцца розныя версіі знікнення падлетка».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by.*

## У МАГІЛЁВЕ ЗНОЎ БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ ЧОРНЫХ РЫЭЛТАРАЎ

**Яшчэ адна сямейная пара ў горадзе існавала за чужы кошт. Адзіная розніца з папярэднікамі — сваіх ахвяр яны не забівалі. Справай 50-гадовага магілёўчаніна і яго 48-гадовай жонкі ўпраўленне Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці займалася з чэрвеня гэтага года.**

— Сужэнцы абвінавачваюцца ў тым, што ў перыяд з 2008-га па студзень 2017 года заключалі незаконныя здзелкі з нерухомасцю, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК.** — Выяўлены 16 эпізодаў іх злачыннай дзейнасці. У Магілёве і Магілёўскай вобласці яны знаходзілі кватэры, дзе пражывалі маламаёмныя, адзінокія і сацыяльна неабароненыя грамадзяне, уваходзілі да іх у давер, схілялі да незаконных здзелак па абмене або продажы кватэр, абяцаючы знайсці ім іншае жыллё, а розніцу ў коштах вярнуць. Пры гэтым выконваць свае абяцанні яны нават не збіраліся. Сума незаконна атрыманых імі грошай склала больш за 526 тысяч рублёў.

Сужэнцы абвінавачваюцца ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных часткамі 1 і 3 артыкула 209 і часткай 2 артыкула 233 (махлярства, здзейсненае ў буйным памеры, і незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць, спалучаная з атрыманнем даходу ў асабліва буйным памеры) КК Рэспублікі Беларусь. На іх маёмасць, у тым ліку грошы, залатыя вырабы, аўтамабіль, нерухомасць агульным коштам 60 тысяч рублёў, накладзены арышт. Мужчына змешчаны пад варту, жанчыне пакуль дазволена застацца на волі пад асабістае паручыцельства.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ПАГРАЖАЎ ТАКСІСТУ НАЖОМ

**Пасля трох гадзін ночы да апаратара службы 102 ГУУС Мінгарвыканкама звярнуўся індывідуальны прадпрымальнік-таксіст, які заявіў, што некалькі хвілін таму невядомы мужчына, якога ён падвозіў, пад пагрозай выкарыстання нажа патрабаваў грошы.**

На месца здарэння тут жа выехаў нарад. Цягам некалькіх хвілін зламыснік, які быў у стане алкагольнага ап'янення, быў затрыманы супрацоўнікамі раённага аддзела Дэпартамента аховы. Ім быў 42-гадовы мінчанін, які пры сабе меў нож. Высветлілася, што грамадзянін каля аднаго з прыпынкавых пунктаў па Партызанскім праспекце падышоў да таксі, каб скарыстацца яго паслугамі. Аднак, сеўшы на задняе сядзенне, дастаў нож і пачаў патрабаваць у кіроўцы грошы. У таго атрымалася пакінуць машыну і выклікаць міліцыю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Дыялог бізнесаў

# НА ІНШЫХ ПАГЛЯДЗЕЦЬ І СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ

## Беларуская прадукцыя рыхтуецца да «захопу» рынкаў

**Міжнародная выставачная дзейнасць — адзін з інструментаў маркетынгу і прасоўвання тавараў, які, нягледзячы на развіццё інфармацыйных тэхналогій, не губляе актуальнасці. Такія мерапрыемствы досыць затратныя, аднак кантракты і пагадненні заключаюцца літаральна на кожнай выстаўцы. Пра асаблівасці стварэння экспазіцый беларускай прадукцыі за мяжой «Звяздзе» расказаў дырэктар прадпрыемства «Белінтэрэкспа» Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Яўген УВЯДЗЕНСКІ.**

### Тавары міжнароднага прызначэння

«Белінтэрэкспа» на працягу 15 гадоў займаецца арганізацыяй дзелавых візітаў беларускага бізнесу ў найбольш перспектыўныя рэгіёны свету. За гэты час удалося адпрацаваць эфектыўны механізм дэманстрацыі магчымасцяў нашых кампаній, лічыць кіраўнік выставачнага апаратара. На думку Яўгена Увядзенскага, папулярным і запатрабаваным фарматам застаецца калектыўная экспазіцыя: «Яна дазваляе комплексна вырашыць мноства пытанняў. Дызайнерскае афармленне і вялікая плошча прыцягваюць увагу наведвальнікаў».

Сёлета «Белінтэрэкспа» правялі 20 выставак за мяжой, з якіх 4 — у рамках нацыянальных экспазіцый Беларусі. Найбольш маштабнае мерапрыемства — у рамках IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Маскве. Больш за 80 навуковых і прамысловых арганізацый дэманстравалі каля 250 інавацыйных распрацовак і экспанатаў, сярод якіх электрамабіль, электробус, сістэма дыстанцыйнага зандзіравання, беспілотнікі, акуляры з тэхналогіяй дапоўненай рэальнасці, распрацоўкі ў сферы інфармацыйных тэхналогій, абсталяванне для кардыялогіі. Па выніках выстаўкі былі падпісаны кантракт па пастаўках поліэфірнага валакна, пагадненне аб стратэгічным супрацоўніцтве «БелАЗа» з «Усходняй горнаруднай кампаніяй» і іншыя падобныя дакументы.

Не менш важным мерапрыемствам стала шматгаліновая выстаўка беларускіх вытворцаў «Made in Belarus», якая прайшла сёлета ў жніўні ў Астане. У ёй удзельнічалі 70 айчынных кампаній, больш як 40 з іх — вядомыя вытворцы прадуктаў харчавання. «Прасоўванню нашых інтарэсаў на выстаўцы дапамагла масіраваная інфармацыйная кампанія. Таксама прадстаўнікі «Белінтэрэкспа» мэтанакіравана запрашалі найбольш цікавых прадстаўнікоў бізнесу па лініі Казахстана. Акрамя таго, было падрыхтавана спецыяльнае маркетынгавае даследаванне, якое дапамагло зрабіць гэты рынак больш зразумелым. У рамках мерапрыемства прайшоў і беларуска-казахстанскі бізнес-форум, у якім прынялі ўдзел прэм'ер-міністры абедзвюх краін», — адзначыў Яўген Увядзенскі.

Упершыню ў гэтым годзе былі праведзены нацыянальныя экспазіцый Беларусі на Кубе, у Алжыры і ў Гуанчжоў (КНР). Асобна варта адзначыць экспазіцыю Беларусі ў рамках XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Сочы і выстаўку беларускай дрэваапрацоўчай галіны ў Вялікабрытаніі.

У параўнанні з 2016 годам агульная плошча беларускіх экспазіцый за мяжой, арганізаваных «Белінтэрэкспа», павялічылася на 25%. Вырасла і колькасць удзельнікаў — сёлета 206 арганізацый. Па галіновай прыкмеце дамінавала прамысловасць і вытворцы прадуктаў харчавання.

### Пагоня за кантрактамі ў бронекамізэльках

На думку дырэктара «Белінтэрэкспа», ёсць што прапанаваць замежнаму спажыўцу і беларускім вучоным. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, Міністэрства адукацыі сёлета актыўна ўдзельнічалі ў выстаўках за мяжой. «Навуковыя распрацоўкі запатрабаваны ўсюды, але для кожнай краіны і рэгіёна трэба падбіраць тое, што адпавядае іх эканамічнай накіраванасці і тэматыцы выстаўкі. У Алжыры, напрыклад, зацікавіліся беларускімі распрацоўкамі, якія дазваляюць абсарбаваць уцечкі нафты. Цяпер вядуцца перагаворы. А на Кубе былі цікавыя нашы дасягненні ў сферы электратранспарту», — расказаў Яўген Увядзенскі.



Фота БЕЛТА.

На выставе Agro Food Drink Tech Expo ў Тбілісі.

Выставачны каляндар «Белінтэрэкспа» на 2018 год уключае больш за 30 мерапрыемстваў за мяжой. Беларуская прадукцыя будзе прадстаўлена ў Судане, Чэхіі, Кеніі, Анголе, Азербайджане, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Таджыкістане, Венгрыі, Румыніі, ЗША, Манголіі, Амане і на Кубе. Плануецца арганізаваць таксама нацыянальныя экспазіцыі ў Кітаі і В'етнаме. Ёсць намеры па ўдзеле ў выстаўках Егіпта, Сірыі, Ірака і Лівана. «Экспазіцыі ў «гарачых кропках» свету патрабуюць асаблівай дасканалай арганізацыі. Можна здымаць вострасюжэтныя серыял на тэму арганізацыі экспазіцыі ў Індыі ці на Кубе. Але трэба сказаць, што ў нашай рабоце яшчэ ні разу не было збояў», — падзяліўся Яўген Увядзенскі.

У жніўні беларускія прадпрыемствы ўдзельнічалі ў дамаскай выстаўцы ў Сірыі. «Гэта знакавае мерапрыемства для краіны, яно праходзіла пасля значнага перапынку. Дамаская выстаўка прадэманстравала, што эканоміка Сірыі ажыццяўляецца. Але неабходна сказаць, што тыя адважныя людзі, якія былі зацікаўлены ў супрацоўніцтве, часта павінны былі хадзіць на мерапрыемствы ў бронекамізэльках», — расказаў Яўген Увядзенскі. Ён падзякаваў пасольству Беларусі ў Сірыі, якое дапамагло вырашыць пытанні бяспекі. Паводле яго слоў, гэтая паездка была прадуктыўнай для Беларусі, таму Сірыя ўключана ў план 2018 года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Інвестыцыі

# НА ЛІТВУ — ТРАНЗІТАМ

## Магчымасць фінансавання рэканструкцыі дарогі, а таксама інфраструктуры прапускнога пункта «Каменны Лог» разглядае Еўрапейскі інвестыцыйны банк

**Трасу М7 Мінск — мяжа Літвы могуць пачаць рэканструяваць ужо ў наступным годзе. Праект падрыхтаваны Міністэрствам транспарту і камунікацый Беларусі і Еўрапейскім інвестыцыйным банкам, паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог — начальнік аддзела ўтрымання аўтамабільных дарог Мінтранса Сяргей ЛЯВОНЧЫК.**



Дарога да мяжы з Літвой уваходзіць у склад еўрамаршруту Е28 і пан'еўрапейскага калідора. Яе рэканструкцыя праводзілася ўжо некалькі разоў, аднак цалкам зрабіць узорную трасу пакуль не атрымалася.

«Праект па мадэрнізацыі трасы быў прапанаваны намі ў ходзе работы з фінансавымі міжнароднымі інстытутамі. Цікавасць да праекта праявіў Еўрапейскі інвестыцыйны банк, асноўная фінансава-крэдытная ўстанова Еўрапейскага саюза», — адзначыў Сяргей Лявончык.

Паводле яго слоў, прадстаўнікі банка ўжо прыязджалі ў Беларусь, азнаёміліся з самой дарогай, падыходамі, інтэнсіўнасцю, мытняй і памежнай інфраструктурамі. Імі прапрацоўваліся і вырашаліся пытанні, як і што можна палепшыць у рамках праекта, наколькі траса М7 з'яўляецца важнай з пункту гледжання транзітных магчымасцяў. Па сутнасці, яна — асноўны калідор для руху грузавога транспарту ў бок Еўрасаюза.

«Мы спадзяёмся і плануем, што ў пачатку наступнага года зможам выйсці на практычную рэалізацыю гэтага праекта. Ужо ёсць папярэднія напрацоўкі па кошце, таксама распрацавана праектная дакументацыя, — адзначыў ён. — Але ўсе разумеюць, што гэта досыць дарагі праект, да таго ж мы паспрабавалі аб'яднаць яго з мытнай інфраструктурай, бо развіваць толькі дарогу без мытнага пункта пропуску немэтазгодна, — на хуткасць перамяшчэння грузаў і тавараў уплывае ў першую чаргу прапускны пункт».

Сяргей Лявончык звярнуў увагу на тое, што еўрапейскія банкі, як і ўсе іншыя, шукаюць найперш эканамічны эфект ад праекта, ім важна зразумець, наколькі эфектыўнае рашэнне будзе прынята, наколькі ўкладзеныя грошы сапраўды пойдуць на паляпшэнне транзітнай прывабнасці. Да таго ж у ходзе работы над праектам павінен быць рэалізаваны шэраг абавязковых патрабаванняў да сацыяльнай інфраструктуры і да бяспекі дарожнага руху.

«Эксперты, якія працуюць у рамках праекта, будуць даваць свае рэкамендацыі, як правільна рэканструяваць дарогу, колькі там павінна быць палос, які хуткасны рэжым, як гарантаваць бяспеку пешаходаў, як павінна весціся будаўніцтва з пункту гледжання ўздзеяння на экалогію, прыроду», — заўважыў ён. — Гэта значыць, праект прадугледжвае вырашэнне цэлага шэрагу пытанняў, але мы спадзяёмся, што з улікам багатага вопыту нашых міжнародных партнёраў будуць прыцягнутыя пэўныя фінансавыя сродкі на выгадных для Беларусі ўмовах».

Як паведамлялася, сёлета ў маі Беларусь і Еўрапейскі інвестыцыйны банк падпісалі рамачнае пагадненне аб супрацоўніцтве. Банк агучыў намер укласці ў 2017 годзе ў фінансаванне беларускіх праектаў да 200 млн еўра. У канцы жніўня банк ужо паведаміў, што разглядае магчымасць фінансавання рэканструкцыі дарогі М7, а таксама інфраструктуры пункта пропуску «Каменны Лог». Крэдыт на рэалізацыю гэтага праекта можа скласці 110 млн еўра.

Да канца 2018 года плануецца завяршыць праект па рэканструкцыі аўтадарогі М-6 Мінск — Гродна. Урадам прынята дзяржаўная праграма па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог на 2017—2020 гады. Згодна з ёй прадугледжана рэканструкцыя ўчастка дарогі Р-23 Мінск — Мікашэвічы і ўчастка дарогі Р53 ад Кургана Славы ў бок Смалявіч у цэментава-бетонным выкананні.

«Будуецца таксама зусім новая дарога ад трасы Р-15 у бок мультымадальнага комплексу Балбасава. Яна таксама будзе цэментава-бетоннай і акажа ўплыў на развіццё лагістычнай інфраструктуры, бо будзе звязваць дадзены комплекс з чыгуначнымі пуцямі, з міжнародным калідорам Е30», — паведаміў Сяргей Лявончык.

Усяго ў наступным годзе будзе адрамантавана 155 кіламетраў дарог. Для будаўніцтва і рамонту задзейнічаюць і сродкі, сабраныя ў якасці дзяржаўнай пошліны за допуск да руху. З пачатку года ў бюджэт іх паступіла больш за 25 мільёнаў рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Грошы

# Тарыф фіксаваны, налічэнні розныя

**Створаная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма разліку за жыллёва-камунальныя паслугі (АІС «Разлік-ЖКП») у цэлым дапушчальная, аднак патрабуе ўдасканалення, лічыць Генадзь ТРУБІЛА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

Меркавалася, прынамсі, што сумы камісій за разлік і налічэнне камунальных паслуг будуць аднолькавыя для ўсіх пастаўшчыкоў паслуг. Аднак на справе лічбы неабгрунтавана завышаюцца. 3,55% — камісія ў Мінску, 5-7% — у сталічнай вобласці, і 10%, напрыклад, — у Магілёве. Каб пазбавіцца ад такіх перакосаў, Мінжылкамгас распрацаваў праект нарматыўна-прававога акта, якім запланавана абмежаваць рэнтабельнасць разлікова-даведачных цэнтраў і зрабіць адзіную суму па краіне.

— З іншага боку, кожны пастаўшчык камунальных паслуг і раней у калькуляцыю закладваў кошт уліку разліку ЖКП, але гэта «хавалася». А доля затрат на гэта магла і 20% перавышаць, — заўважыў **Алег ПАСКРОБКА, старшыня Салігорскага райвыканкама.**

Цэнтралізаваная сістэма разліку дазволіла наладзіць адзіны для ўсёй краіны тарыф за прыём плацяжоў за ЖКП. Банкі бяруць за гэта з пастаўшчыкоў паслуг (камунальнікаў) 1% ад сумы. Паслугі АРІП аплачваюць арганізацыі, што налічваюць сумы за ЖКП, зыходзячы з фіксаванай сумы 0,09 капейкі за канкрэтную паслугу на адзін асабовы рахунак. Спажыўцы пры гэтым ніякія камісіі не плацяць, растлумачыла **Алена АНТОНІ, старшыня праўлення ААТ «Небанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя «АРІП».**

АІС «Разлік-ЖКП» зрабіла налічэнні за «камуналку» празрыстымі. Дзякуючы ёй можна ўбачыць, колькі, калі, чаму і за што налічана спажыўцу. Сістэмай ахоплена больш за 96% насельніцтва, у яе ўваходзіць 4,3 мільёна асабовых рахункаў.

Генадзь Трубіла паведаміў, што праграма з часам можа дапоўніцца магчымасцю дыстанцыйнага зняцця паказчыкаў з прыбораў уліку вады і цяпла ў кватэрах. Праўда, для гэтага трэба наладзіць пакватэрную сістэму ўліку, чаго пакуль няма.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск №22 (89)



# АНЁЛ НА ЗЯМЛІ

Ніколі не забудуся, як у дзяцінстве згубіла малодшую сястру. Мама папрасіла мяне прыглядзець за Наташай, пакуль сама ўправіцца па гаспадарцы. Роля нянькі мне не вельмі падабалася, таму аддала малой свае любімыя цацкі і сказала ёй чакаць у пясочніцы. Сама ж пабегла да сяброў гуляць у хованкі. Ужо пачало змяркацца, калі я ўбачыла маму ў слязах: «Дзе Наташа? Яе нідзе няма...» Мы разам абышлі суседзяў, але ўсё безвынікова. Калі ж у роспачы вярнуліся дадому, раздаўся тэлефонны званок. Тэлефанавала бабуля Алесі (апошняя — аднагодка нашай Наташы), якая жыла на іншым канцы вёскі: «А вы сваю дачушку забіраць не збіраецеся?»

Сёння гэтую гісторыю ў нашай сям'і ўспамінаюць са смехам. А тады ж, паверце, было зусім не да яго.

Апошнія некалькі дзён у сацыяльных сетках мае знаёмыя актыўна перапошчваюць ролік амерыканскага блогера. Малады чалавек праверыў, ці лёгка выкрасці малечу з дзіцячай пляцоўкі.

Джо падыходзіў да маладых маці і казаў: «Я праводжу сацыяльны эксперымент. Як часта вы кажаце свайму дзіцяці, што нельга размаўляць з незнаёмцамі?» — «Прыкладна кожны дзень», «Часта», — адказвалі жанчыны. «А як вы думаеце, калі я зараз падыду да вашага дзіцяці з сабакам, малеча загаворыць са мной ці пабяжыць да вас?» — «Напэўна, пабяжыць да мяне», «Я ўпэўнена, што мая дачка не стане з вамі размаўляць, але паспрабуйце». І Джо паспрабаваў.

«Прывітанне!» — «Прывітанне!» — «Глядзі, які сабачка!» — «О, сабачка!» — «Ён табе падабаецца?» — «Так». — «Здагадайся, як яго завуць?» — «Данкін?» — «Амаль, яго завуць Донатс. Хочаш яго пагладзіць? У мяне ёсць яшчэ шмат сабак. Хочаш пайсці са мной і паглядзець на іх?» Пасля прыблізна такога дыялогу дзеці працягвалі незнаёмцу руку і пакідалі дзіцячую пляцоўку, нават не ўспомніўшы пра маму.

Рэакцыю матуль, якія назіралі за гэтым, уявіць няскладана. Яны падхапіліваліся са сваіх лавачак і моцна абдымалі сваіх крывіначак. Усе яны дзякавалі блогеру за эксперымент, які прымусіў іх задумацца і, магчыма, папярэдзіць бяду ў будучым.

У каментарыях пад гэтым ролікам большасць піша пра тое, што бацькам трэба часцей размаўляць з дзецьмі пра бяспеку, разыгрываць розныя сітуацыі і на практыцы вучыць правілам паводзін на вуліцы. Несумненна. Але, на маю думку, гэтага недастаткова.

Улетку, гуляючы па дворыках Мінска, я часта бачыла маладых матуль з мабільнымі тэлефонамі каля вуха. Замест таго каб гуляць са сваім 4—5-гадовым дзіцем, яны захоплена размаўлялі з сяброўкамі. Аднойчы нават чула, як жанчына сказала сваёй 5-гадовай дачцэ: «Леначка, пагуляй тут адна пяць хвілінак, а я хуценька збегаю ў краму». Паводле слоў амерыканскага блогера, штодзень выкрадаюць больш за 700 дзяцей, гэта больш за чвэрць мільёна ў год. Вядома, Беларусь — не Амерыка. У нас адносна спакойна і мірна. Але хто гарантуе, што за гэтыя пяць хвілін да Леначкі не падыдзе дзядзька з сабачкам?..

За дзень да свайго нараджэння дзіця запыталася ў Бога:

— Кажуць, заўтра мяне пасылаюць на Зямлю. Чула, што там ёсць зло. Як жа я, такое малое, буду там жыць? Хто абароніць мяне?

— Я падару табе анёла, які будзе клапаціцца пра цябе, — адказаў Бог.

— А як завуць майго анёла?

— Імя не мае значэння. Ты будзеш называць яго Мама.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Тыя, хто побач

# ЯК УСЁ ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЦЬ РАЗАМ З БАЦЬКАМІ

## І НІ РАЗУ НЕ ПАСВАРЫЦЦА



Дзед і ўнук ТУЛЬВІНСКІЯ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**З кіраўніком цымбальнага аркестра «Першацвет» Віктарам ТУЛЬВІНСКІМ і яго жонкай-цымбалісткай Алай я пазнаёмілася падчас сумеснай камандзіроўкі ў Новасібірск. Разам з сямейнай парай тады гастраляваў іх былы зяць Павел. Апошні, акрамя таго, што іграе ў «Першацвеце» на флейце, дык яшчэ і працягвае працаваць поплеч з былой жонкай, цесцем і цешчай у адной школе выкладчыкам. Калі я пра гэта даведалася, са здзіўленнем спытала: «Як вам удалося захаваць добрыя адносіны з былым мужам дачкі? Можа, ёсць які сакрэт?» На што атрымала лаканічны адказ: «Сакрэт у нашай дачцэ».**

**Нядаўна я завітала ў госці да музычнай сям'і Тульвінскіх. Пасля размовы падумалася, што гэтыя людзі — знаходка для любога кінарэжысёра. Ды яны і самі жартам параўноўваюць сваё жыццё з «Санта-Барбарай».**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ Творчы падыход

# ЖЫРАФА ПА МЯНУШЦЫ МАКАРОНА

## ПРА ШТО ДЗЕЦІ ЗДЫМАЮЦЬ УЛАСНЫЯ МУЛЬТФІЛЬМЫ

**Глядзець мульцікі, бадай, любімы дзіцячы занятак. Лепей толькі здымаць іх... самому. Набор спісаных алоўкаў, тысяча малюнкаў, тры месяцы работы — і маленькі шэдэўр гатовы. Якія сюжэты прыдумляе малеча? І чаму дарослым лепш не ўмешвацца ў дзіцячую творчасць? Пра гэта расказалі ў Школе дзіцячай мультыплікацыі.**

### ПЛАСТЫЛІНАВЫЯ ГЕРОІ, МАННЫЯ БЕРАГІ

— Я не вучу дзяцей акадэмічнаму малюнку. Мая задача — разняволіць іх творча, а не «прычасаць». Многія прыходзяць і кажуць, што не ўмеюць маляваць, ляпіць. А потым праз месяц выдаюць такія вынікі, што дзіву даешся. У гэтых дзяцей атрымліваецца больш арыгінальна, бо іх не стрымліваюць правілы, — кажа **кіраўнік студыі «Энфіс» Наталля КУЛІБАВА.**

Па адукацыі яна псіхолаг і арт-тэрапеўт. Пасля ўніверсітэта працавала ў дашкольнай установе, але зразумела, што стандартныя методыкі не заўсёды дзейсныя. І пачала шукаць іншыя спосабы дастукацца да дзіцячай душы. Наткнулася на прапанову паўдзельнічаць у курсах па мультэрапіі, якія былі арганізаваны расійскім Фондам кіно. А пасля гэтага загарэлася ідэяй стварыць студыю дзіцячай анімацыі, дзе малеча можа выліць сваю энергію, набалелае праз творчасць. Да таго ж дзядзька Наталлі працаваў мультыплікатарам на «Беларусьфільме», таму яна добра знаёмая з гэтым мастацтвам.



*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Справы сямейныя

# Ці з'яўляецца дакумент панацэяй ад спрэчак?

## Адвакат Пётр Вянглінскі: «Беларусы яшчэ не гатовыя да заключэння шлюбных дагавораў»

**Калі жаніх з нявестай ідуць у ЗАГС, іх перапаўняе каханне. Але ніхто з маладых не думае аб тым, што праз гады некаторыя з іх могуць сустрэцца ў іншай дзяржаўнай установе — судзе. Як засцерагчы сябе ад магчымых спрэчак з-за раздзелу маёмасці? Аб гэтым можна падумаць загадзя і заключыць шлюбны дагавор. Пра тое, ці распаўсюджаны такія дагаворы ў Беларусі, якія «падводныя камяні» могуць узнікнуць пры іх падрыхтоўцы, як падзяліць лыжкі і відэльцы, нам расказаў адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Пётр ВЯНГЛІНСКІ.**



### Вяселле, развод і прававы нігілізм

***— У сродках масавай інфармацыі часта можна ўбачыць матэрыялы пра тое, як на Захадзе зоркі прапісваюць сямейныя абавязкі і маёмасць у шлюбным дагаворы. Ці часта беларусы звяртаюцца да юрыста з просьбай скласці такі дагавор?***

— Рэдка. Думаю, што гэта звязана з нашым менталітэтам. Ёсць у людзей такая перакананасць, што калі юрыдычна замацаваць нейкія правы і абавязкі, то ўсё: чакай бяды. Памятаю, як аднойчы да мяне прыйшла маладая пара. У хуткім часе пасля вяселля яны вырашылі заключыць шлюбны дагавор. Сям'я была забяспечаная, вядома, ім было што дзяліць. Я іх пракансультаваў, падрыхтаваў праект дагавора. Але праз некалькі дзён прыйшлі іх бацькі і пачалі ўдзельнічаць у абмеркаванні праекта. Потым бацька таго маладога чалавека раптам сказаў: «Калі шлюбны дагавор будзе заключаны, то нашых дзяцей чакае развод». Я не ведаю, ці зарэгістравалі маладыя людзі тое пагадненне ў натарыуса.

**У шлюбны дагавор на працягу жыцця можна ўносіць змяненні ці наогул яго скасаваць. Праўда, зрабіць гэта можна толькі знаходзячыся ў шлюбе. Пасля разводу ануляваць яго нельга.**

Безумоўна, ёсць ахвотныя заключыць такое пагадненне, але нельга сказаць, што з кожным годам шлюбных дагавораў становіцца больш, гэта адзінкавыя выпадкі. Напэўна таму, што нашым грамадзянам пакуль што ўласцівы прававы нігілізм. На Захадзе ў людзей ёсць, напрыклад, асабісты ўрач, адвакат, з якім яны кансультуюцца па важных сямейных пытаннях. У нас жа такога няма. Толькі калі нешта здарыцца, тады ўжо былыя сужэнцы наракаюць: «І чаму мы не заключылі шлюбны дагавор?».

***— Хто прыходзіць з просьбай падрыхтаваць шлюбнае пагадненне? Колькі гадоў такім сужэнцам? Якое іх сацыяльнае становішча?***

— На кансультацыю прыходзяць пары рознага ўзросту, часцей за ўсё гэта людзі ад дваццаці да сарака гадоў. Не скажу, што заўсёды яны маюць некалькі кватэр, пару аўтамабіляў і зямельны ўчастак. Візіт да юрыста не залежыць ад багацця.

### Калі мы купім дом...

***— Ці звяртаюцца да вас сужэнцы, якія пражылі разам шмат гадоў, але ўсё ж такі пажадалі заключыць такое юрыдычнае пагадненне?***

— Бываюць такія выпадкі. Да мяне звярталіся муж з жонкай, абаім было дзесьці па пяцьдзясят гадоў. Адносіны ў іх не складваліся. Муж — індывідуальны прадпрымальнік, жонка таксама працавала. Яму ўдавалася ўтойваць ад другой паловы свае заробкі, магчыма, нейкая маёмасць была афармлена на трэціх асоб. І жонка хацела замацаваць свае правы на тое, што яны нажылі. Гэты выпадак запомніўся тым, што сужэнцы вырашылі не толькі тое, каму дастанецца кватэра, лецішча, аўтамабіль у выпадку разводу, але і падзялілі рэчы, якія юрысты называюць «лыжкі-відэльцы»: бытавую тэхніку, мэблю, асабістую маёмасць.

***— Што можна прапісаць у шлюбным дагаворы?***

— У ім можна агаварыць, як пасля разводу будзе дзяліцца сумесна нажытая падчас шлюбу маёмасць: нерухомасць, аўтамабілі, зямельныя ўчасткі. Таксама ў дакуменце можна прадугледзець парадак сустрэч з дзецьмі, унесці правы і абавязкі сужэнцаў па ўзаемным утрыманні пасля скасавання шлюбу. Таксама можна прапісаць, у каго застанецца каштоўныя падарункі, якія муж падарыў жонцы. Наогул, няма такога правіла, якія пункты абавязкова павінны быць у шлюбным дагаворы. Іх вызначаюць муж і жонка.

***— Ці можна ў такім дакуменце прапісаць, як у выпадку разводу будзе дзяліцца сумесны бізнес?***

— Калі я рыхтаваў праекты шлюбных дагавораў, мае кліенты бізнес не дзялілі. Са слоў сваіх калег ведаю, што звычайна гэты пункт не прапісваецца ў дагаворы, бізнес пасля разводу дзеліцца ўжо ў судзе. Як правіла, калі хтосьці з сужэнцаў, напрыклад муж, індывідуальны прадпрымальнік, то ён не захоча дзяліцца актывамі ці даходамі ад сваёй справы з ужо чужым чалавекам. У дагаворы ён будзе імкнуцца захаваць свой бізнес за сабой. Пра дзяцей у такіх сітуацыях думаюць, а пра былога сужэнца звычайна не. Але, калі муж і жонка пажадаюць, гэты пункт можна прапісаць у дагаворы. Напрыклад, у такім юрыдычным пагадненні можна вызначыць працэнт прыбытку ад бізнесу, які пасля шлюбу будзе атрымліваць былы муж ці жонка.

***— Якія пункты нельга ўносіць у гэта юрыдычнае пагадненне?***

— У такім дакуменце нельга прапісваць тую маёмасць, якой яшчэ няма. «Калі мы купім дом, то ён будзе належаць...» — такіх умоў у шлюбным дагаворы быць не можа. Калі потым сужэнцы нешта набудуць (прычым законным шляхам), то шлюбны дагавор можна памяняць.

Нельга ў шлюбным дагаворы забараніць аднаму з бацькоў бачыцца з дзецьмі пасля разводу, толькі калі былы муж ці жонка пазбаўлены бацькоўскіх правоў.

### «Мерседэс», «лексус» і трэція асобы

***— Ці ўзнікаюць спрэчкі паміж сужэнцамі падчас падрыхтоўкі шлюбнага дагавора?***

— Так, бывае, што муж і жонка спрачаюцца з-за сваёй маёмасці, калі яна дарагая. Калі яны самі не могуць яе падзяліць, то я дапамагаю ім разабрацца, каму застанецца дом, каму — кватэра, каму — «мерседэс», каму — «лексус»... Каб было менш спрэчак, на кансультацыі па пытанні шлюбнага дагавора я прашу сужэнцаў, каб яны загадзя падрыхтавалі спіс, дзе будуць дзве калонкі: што пасля разводу дастанецца яму, а што — ёй. Але звычайна людзі дома рыхтуюцца да размовы з адвакатам, і абмеркаванне праекту гэтага юрыдычнага пагаднення абыходзіцца без сварак.

***— Якія «падводныя камяні» могуць узнікнуць пры падрыхтоўцы дагавора?***

— Самае галоўнае ў такой справе — уменне дамовіцца са сваёй другой паловай. Важна, каб маёмасць, якую збіраюцца дзяліць сужэнцы, была іх уласнасцю, а не належала трэцім асобам: сваякам, сябрам, знаёмым. Да мяне прыходзіла сямейная пара, у якой была свая вытворчасць. Сужэнцы захацелі гэты бізнес зарэгістраваць у шлюбным дагаворы. Муж з жонкай думалі, што ўсё ў памяшканні, якое было афармлена на кагосьці з іх, таксама належыць ім. Аказалася, што абсталяванне, якое там знаходзілася, было запісана на знаёмага. Таксама сужэнцы павінны мець дакументы, якія пацвярджаюць іх права ўласнасці. Тады заключэнне шлюбнага дагавора будзе законнай грамадзянска-прававой здзелкай і ніякіх падводных камянёў не ўзнікне.

***— Ваша парада: заключаць ці не заключаць шлюбны дагавор?***

— Я раю сужэнцам складаць такі дакумент, бо потым яны абое будуць юрыдычна абароненыя.

**Анастасія ПЕЦЬКО** ■



■ Людзі і лёсы

# КОЖНЫ ВЫБІРАЕ ПА САБЕ

**Бабуля Грыпіна заўжды падымалася рана, ёй вечна не спалася — даймалі турботы. Усё думала, калі і як што зрабіць, хоць на сябе ўжо надзей не мела — не тыя сілы. Добра, што ёсць дачка ды зяць, дарослыя ўнукі. Усе яны — нельга скардзіцца — шкадуюць старую, слухаюць, што яна кажа, і ёй жа ўдзячныя, бо самую непрыемную для ўсіх работу бабуля робіць сама: на дзявятым дзясятку шторанак на росную траву выганяе карову. Тая спакойна скубе, а пастушка — дзе седзячы, дзе стоячы абапёршыся на кіёк, — задуменна разглядае наваколле.**

Усё ёй тут звыклае, усё да болю знаёмае: вёска, дарога, жытнёвае поле. «Каласы ўжо спелыя, — падумала бабуля, — праз тыдзеньчык трэба жаць». Вочы яе міжволі «зачапіліся» за сінія зорачкі васількоў, у спеве жаўрукоў вушы злавілі сумнае «ку-ку».

Бабуля хацела палічыць, колькі ёй засталося жыць, але ж зязюля ці не з глузду з'ехала: замест будучых гадоў стала лічыць пражытыя.

...Усе яны прайшлі ў горы ды пакутах, але ж часу плакаць у жанчыны не было: дзень і ноч працавала, чым магла, дапамагала людзям. І яны ёй — таксама... Інакш бы адна, без мужа, не выжыла, не паставіла б на ногі пяцёра дзяцей.

Усе яны, дзякаваць богу, выраслі працавітымі ды спакойнымі, усе звілі сабе гнёзды ў розных канцах былога Саюза. А яна тым часам зусім састарэла — згубіла недзе ранейшы спрыт. А, здавалася ж, зносу не будзе.



Разам з ёй састарэла і вёска. Шмат пустуючых хат: гаспадары іх «пераехалі» на блізкія могілкі. Некага даканала немач ды старасць, некага — скнапнасць. Дурная гэта хвароба. Яна, як і розныя іншыя, падрывае здароўе, псуе характары, разбурае сем'і, дамы. Узяць хоць бы гэты, суседскі (бабуля з сумам паглядзела на зарослую бульнягам будыніну з выдранымі дзвярыма і вокнамі). Некалі ж тут усё красавала: да дыхтоўных пабудоў вялі акуратныя дарожкі з цэменту, абапал — красавалі ружы ды вяргіні, за імі пачынаўся раскошны сад... Заможна жылі суседзі: гэта ў калгаснікаў быў пусты працадзень, а ў гэтых мужа і жонкі — добрыя аклады, сувязі, блат. Жывую капейку мелі і з гаспадаркі. А ўсё роўна мала было! У роднай сястры, што глядзела бацькоў, адсудзілі спадчыну...

Вось толькі згоды ў дом грошы не прыносілі. Гаспадар любіў выпіць, і тады ўжо ў хаце нікому не было. І сам лютаваў, і дзецям у вушы ўводзіў, што яны тут — самыя багатыя, самыя разумныя, самыя ўдалыя, а ўсе астатнія — зброд, шушамець...

Зерне пасеянай пыхі стала даваць усходы: сын багацеяў славіўся тым, што не хацеў вучыцца сам і не даваў іншым, крыўдзіў слабейшых, зрываў урокі.

Школу ў выніку так і не скончыў. Ісці працаваць (атэстат аб сярэдняй адукацыі маці прыдбала)? «А навошта? — адкрытым тэкстам пытаў, — калі ў бацькоў грошай столькі, што хопіць яшчэ і ўнукам.

У яго такім чынам з'явіўся час, які трэба было нечым запаўняць. Найлепей, вядома ж, прыемнымі сустрэчамі ды застоллямі.

Не ўсе яны праходзілі гладка. Здаралася, што чаргаваліся чаркі не толькі са сваркамі, але і з бойкамі, пошукам «прыгод». У бацькоў, адпаведна, з'явіўся новы клопат — пастаянна «выкупляць» нашчадка з міліцыі, шукаць уплывовых заступнікаў, наймаць адвакатаў...

Спачатку ім гэта ўдавалася, але ж потым — не. Розныя былі злачынствы, розныя тэрміны пакарання, а вынік адзін: вярнуўшыся, гэты бэйбус браўся за сваё — прымаў «гасцей», здаралася, падымаў руку на «старых» (інача не зваў), калі яны пярэчылі ці не давалі грошай.

Адна з такіх «разборак» скончылася трагедыяй: вырасціла маці сына — аддзячыў.

...У прасторных пакоях іх некалі багатага дома цяпер за ўсю гаспадарыць вецер. Часам ён тужліва свішча, быццам сумуе па гаспадарах, якія верылі, што ўсё ў жыцці вырашаюць грошы... Памыліліся: зарасла бульнягом не толькі іх сядзіба, зараслі магілы на могілках.

...Бабуля Грыпіна — як цяжка ні было — не зайздросціла сваёй багатай суседцы раней. Не зайздросціць і цяпер, бо лепей пасвіць кароўку, чым парыць зямлю.

**Марыя СУШКО.**

*Бярэзінскі раён* ■

■ Лісты Дзеду Марозу

# ЗАБЯРЫ МОЙ БОЛЬ



Дзверы кабінета адчыніліся, у яго ўвайшла маладзенькая сакратарка.

— Аркадзь Сяргеевіч, усё гатова. Дзед Мароз і Снягурка на месцы. Можам выязджаць, — сказала яна.

— Дзякуй, Юля, ужо іду, — адказаў мужчына.

Праз дзесяць хвілін аўтамабіль ад'язджаў ад офіса ў напрамку дзіцячага анкалагічнага дыспансера.

* * *

Некалі ў ім лячыўся маленькі хлопчык Аркадзя. На шчасце, ён перамог цяжкую страшную хваробу, прайшоў неабходныя працэдуры, балючыя шматгадзінныя крапельніцы хіміятэрапіі. А шмат хто з яго маленькіх сяброў па няшчасці — не. З таго часу мінула трыццаць гадоў. Хлопчык Аркадзік скончыў школу, інстытут і застаўся, стаў паспяховым бізнесменам, чалавекам жорсткім і чэрствым. Са свайго ўласнага досведу ён ведаў: пакуль адны шукаюць грошы на новы смартфон, камп'ютар ці адпачынак за мяжой, шмат хто жыве зусім іншымі клопатамі. Ёсць людзі, якія проста мараць выжыць. Перамагчы хваробу.

Каб падтрымаць такіх жа дзяцей, якім некалі быў сам, мужчына перыядычна ахвяраваў грошы анкалагічнаму дыспансеру, імкнуўся ажыццявіць мары дзяцей пад Новы год. Гэта для яго стала ўжо традыцыяй.

Некалі яго інтэнсіўная тэрапія таксама праходзіла ў навагоднія дні. Нягледзячы на лячэнне, яны — дзеці — чакалі падарункаў, сустрэчы з казачнымі героямі. Шмат хто з іх не ўмеў яшчэ нават пісаць. Але ўсе яны марылі аб адным — стаць здаровымі. Толькі не ва ўсіх гэтае жаданне спраўдзілася... Але навагоднія падарункі яны атрымалі. Аркадзік — канструктар-самалёт. Ён і цяпер, як напамінак мінулага, стаіць у яго на шафе ў працоўным кабінеце.

Зараз пад Новы год з анкалагічнага дыспансера яму дасылаюць лісты-пажаданні дзяцей. Ён чытае іх і ўспамінае сябе. А потым, не шкадуючы грошай, набывае неабходнае, наймае Дзеда Мароза і Снягурку і едзе па звыклым маршруце, каб зрабіць дзецям свята.

* * *

Лісты Дзеду Марозу прыходзяць розныя.

*«Шаноўны чараўнік! Мая самая вялікая мара — пазбавіцца ад болю і забыцца пра яго назаўжды. Але дзякуючы яму я зведаў сапраўдную цану жыцця. Я ўмею радавацца простым імгненням і не спакушаюся на розныя дарагія рэчы, якія сталі неабходнымі атрыбутамі для маіх аднагодкаў. На Новы год мне хацелася б атрымаць звычайны яблычны пірог. Падзяліцца ім з астатнімі хлопчыкамі і дзяўчаткамі. Каб усе мы разам пасядзелі за адным сталом».*

**Вова, 11 гадоў.**

*«...Я разумею, што цяжка хворая. Але куды цяжэй мне бачыць, як пакутуюць родныя людзі. Мне хочацца стаць здаровай, каб бачыць іх шчырыя ўсмешкі.*

*...Я мару стаць мастачкай. Я буду маляваць толькі шчаслівых людзей. Каб на карцінах яны дарылі пазітыўныя ўсмешкі наведвальнікам маіх выставак.*

*Дзед Мароз, у падарунак мне хацелася б атрымаць альбом для малявання і найлепшыя фарбы. Першыя партрэты ўрачоў і маіх самых лепшых сяброў я хачу намаляваць тут. Я размяшчу іх на сценах бясконцых калідораў. Я шчыра спадзяюся, што ўсім будзе прыемна».*

**Аліна, 12 гадоў.**

*«Шаноўны чараўнік, сёння зіма, але я ўспамінаю аб пазамінулым годзе..*

*Тады я быў здаровы. Мы з бацькамі адпачывалі каля ракі. Расклалі вогнішча, а потым на вуголлі рабілі шашлыкі. Зараз мне хацелася б зведаць смак шашлыку. Вядома, калі дазволяць дактары. Здаецца, у гэтыя дні яны не будуць забараняць мне рабіць тое, што хочацца...»*

**Максім, 11 гадоў.**

* * *

... У чароўным мяху Дзеда Мароза ляжаць падарункі для дзяцей. Магчыма яны стануць апошнім шчаслівым момантам у іх жыцці. Магчыма, дапамогуць выжыць. Галоўнае — верыць у лепшае. І тады мары могуць здзейсніцца.

Аркадзь Сяргеевіч ведае гэта на ўласным досведзе.

**Андрэй СІДАРЭЙКА**

■ Агарод на падаконніку

# Карысная зеляніна да навагодняга стала

## Як паспець яе вырасціць у сябе дома

**Непасрэдна ў аўтара гэтых радкоў смачная і карысная агародніна расце ў гарадской кватэры амаль круглы год. Але здзівіць мяне сапраўды ўдалося старшыні праўлення экалагічнай установы «Агра-Эка-Культура» Лане Сяменас. Яна пакрокава растлумачыла, як хутка і беспраблемна наладзіць зімовы агарод у сябе дома на падаконніку. Паводле яе слоў, цяпер у Еўропе папулярныя два новыя напрамкі хатняй зеляніны. Гэта прарасткі і «хуткія лісточкі», якія спецыялісты завуць мікра-зелянінай. Усё гэта любы з нас паспее вырасціць да навагодняга свята.**

### ЦУДА-ЕЖА ПРАЗ 10 ГАДЗІН

Са старажытных часоў лічыцца, што парасткі — самая багатая на ферменты ежа на ўсёй планеце. Асобныя спецыялісты кажуць, што харчаванне ёй спрыяе амаладжэнню ўсяго арганізма, аднаўленню абмену рэчываў і зніжэнню вагі, паляпшэнню стану валасоў, зубоў, пазногцяў. Парасткі не маюць абмежаванняў у сумяшчальнасці з іншымі прадуктамі, іх карысна ўжываць з садавінай і ягадамі, агароднінай, дадаваць у дэсерты, салаты. З «жывога» зерня рыхтуюць гаючы напой раджывелак, і не менш папулярную страву спраўтс — зялёныя парасткі зернебабовых і злакавых культур. Штодзённая норма спажывання іх 20—70 грамаў.



**Здаровы сняданак.**

Зараз пяройдзем да практыкі. Насенне трэба перабраць і насыпаць у шкляны слоік, запоўніўшы яго на 1/4 аб'ёму. Заліць яго падрыхтаваным у асобнай ёмістасці ружовым растворам марганцоўкі, змяшаць і пакінуць на 3—5 хвілін. Дэзынфекцыя — абавязковая працэдура. Потым раствор марганцоўкі зліць, тройчы прамыць насенне вадой.

Прамытае насенне заліць вадой да 2/3 аб'ёму слоіка і пакінуць пры пакаёвай тэмпературы, але не на прамым сонечным святле. Ваду выкарыстоўваць фільтраваную альбо крынічную. Праз 10—12 гадзін, калі насенне набухне, ваду зліць, слоік прыкрыць накрыўкай, каб не было актыўнага выпарэння.

Усё, цуда-ежа гатовая да ўжывання. Выкарыстоўваць яе рэкамендуюць на працягу пяці дзён, захоўваць пры тэмпературы 2—5 °С цяпла. Ёмістасць, у якой яна захоўваецца, не трэба закрываць занадта шчыльна (парасткі павінны дыхаць). Кожную раніцу ўсю атрыманую порцыю трэба дэзынфікаваць і прамываць, а потым выкарыстоўваць.

Любое прарослае насенне лепш з'ядаць на сняданак. Вы можаце ўжываць яго сырым, старанна жуючы, а можаце ўводзіць у склад салаты. Парасткі можна класці цэлымі, а можна здрабніць у мясасечцы і злучыць з цёртай морквай, мёдам, арэхамі, сухафруктамі, сокам лімона, свежай зелянінай.

Прасцей за ўсё займацца парасткамі пшаніцы і жыта, але ёсць чатыры расліны, на якія варта асобна звярнуць увагу. Насенне зялёнай грэчкі, сланечніку, фасолі «маша» і «адзука» ды гароху.

### «ХУТКІЯ ЛІСТОЧКІ» ДЛЯ ВАШАЙ САЛАТЫ

Калі хочаце зрабіць ежу па-сапраўднаму пікантнай і, вядома ж, карыснай, — тады мікра-зеляніна — гэта выдатны спосаб. Тым больш яна вельмі хутка вырошчваецца! Для атрымання «хуткіх лісточкаў» можна выкарыстоўваць практычна ўсе зялёныя культуры — гэта і буракі, і крэс-салата, і рукала, і кінза, і радыска... Дадзеная тэхналогія прадугледжвае вырошчванне з насення. Выключэнне складаюць хіба што цыбулькавыя культуры, такія як шалот ці духмяная цыбуля, у якіх вельмі тонкае «пяро», што цалкам адпавядае тэрміну «мікра-зеляніна».



**Мікра-зеляніна ўласнай вытворчасці.**



**Дамашні сельдэрэй.**

«Хуткія лісточкі» ў асноўным прынята вырошчваць у монакультуры, аднак дапушчальна і змешванне некалькіх відаў. Самастойна падабраць патрэбную камбінацыю раслін, якія прарастаюць у адзін і той жа час, даволі складана, таму лепш звярнуцца ў спецыялізаваныя крамы, дзе прадаюцца ўжо гатовыя сумесі.

У якасці кантэйнераў для вырошчвання падыдуць абсалютна любыя ёмістасці, галоўнае, каб яны былі шырокія, і даволі глыбокія. Грунт мэтазгодна выкарыстоўваць пакупны, прызначаны для расады.

Насенне трэба высейваць раўнамерна па ўсёй паверхні кантэйнера. Да з'яўлення першых парасткаў ёмістасць неабходна паставіць у цёмнае месца. Але са з'яўленнем першых расточкаў яе трэба пераставіць на падаконнік. У далейшым расліна не патрабуе адмысловага і складанага догляду — трэба толькі своечасова ўвільгатняць глебу і, калі неабходна, усталёўваць дадатковыя крыніцы святла.

Да збору ўраджаю можна прыступаць па дасягненні парасткамі вышыні ў 7—10 сантыметраў. Можна зрэзаць усю зеляніну, але тады спатрэбіцца закладка новага міні-парнічка. Найбольш рацыянальна праводзіць выбарачную ўборку, рэгулюючы гушчыню стаяння раслін. Прарэджванне забяспечвае пакінутыя экзэмпляры большай плошчай харчавання і стварае спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця. Можна выкарыстоўваць у ежу асобныя лісточкі, абрываючы больш развітыя. Так можна значна падоўжыць тэрмін эксплуатацыі міні-агарода.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

### Хіт-парад для хатніх «градак»

Для вырошчвання цыбулі не патрабуецца нават зямля. Пасадзіце яе на слоічак з вадой, каб яе ніжняя частка заўсёды была ўвільготнена, і праз два тыдні здымайце першы ўраджай. Кроп можна сеяць у глебу без замочвання, галоўнае — забяспечыць рэгулярны паліў. Насенне пятрушкі лепш на суткі заліць цёплай вадой, затым высушыць і націрці сухім пяском — дзякуючы гэтаму насенне загартуецца, узбагаціцца мінеральнымі рэчывамі і ўзыдзе хутчэй. Пятрушка любіць вільгаць, таму палівайце яе часцей, не дапускайце перасыхання зямлі.

Сельдэрэй не любіць вільгаць і ўсходзіць вельмі павольна — на працягу 2—3 тыдняў, калі вы будзеце вырошчваць яго з насення. Ёсць больш просты спосаб атрымаць смачную і карысную зеляніну. Трэба адрэзаць ад набытага ў краме сельдэрэя частку храпкі, паставіць яе ў ваду, дачакацца карэньчыкаў і першых лісцікаў, а потым пасадзіць у гаршчок. Праз два тыдні лісця стане больш і вы зможаце прыгатаваць салату для ўсёй сям'і.

Набытыя ў краме галінкі мяты трэба паставіць у шклянку з вадой, дачакацца карэньчыкаў і пасадзіць у гаршчок. Маяран выдатна расце з насення, можа зімаваць на ўцепленым балконе і лёгка перанесці недахоп святла.

Цуд хатняга агарода, дэкаратыўныя ампельныя клубніцы пладаносяць круглы год ва ўмовах дрэннай асветленасці, таму яны ідэальна падыходзяць для пакаёвых умоў. Для пачатку высадзіце кусцікі ў гаршчкі, патрымайце два тыдні ў халодным месцы, а потым перамясціце клубніцы ў спецыяльны грунт. Пасля гэтага вам давядзецца іх паліваць, а пасля цвіцення «папрацаваць» пчалой, апыляючы сукведці з дапамогай ватных палачак.

# ЯК УСЁ ЖЫЦЦЁ ПРАЖЫЦЬ РАЗАМ З БАЦЬКАМІ...


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сямейны ансамбль ТУЛЬВІНСКІХ.

## «Зяць вырашыў даць сыну прозвішча Тульвінскі»

***— Вы сказалі, што сакрэт добрых адносін з былым зяцем у вашай дачцэ. Што гэта значыць?***

**Віктар Сцяпанавіч:** Пасля разводу я запытаўся ў Тані: «Ты ўжо, напэўна, не будзеш кіраваць «BREVISам»?» (Ансамбль старадаўняй музыкі, які Таццяна Тульвінская стварыла разам з былым мужам. — **Аўт.**). Але пачуў у адказ: «Чаму не буду? Гэта ж наша агульная справа, прычым любімая. Тое, што мы з Пашам развяліся, не значыць, што застанёмся ворагамі. Тым больш у нас агульны сын».

***— Таццяна, але ж большасць пар пасля разводу сапраўды сябрамі не назавеш. Мала таго, жанчыны часта забараняюць былому мужу бачыцца з дзецьмі...***

**Таццяна:** Я не забараняла тату бачыцца з Уладзікам. На мой погляд, гэта эгаістычна з боку жанчыны. Якія адносіны будуць у пары пасля разводу, залежыць ад мудрасці і шчырасці абаіх. Я, напрыклад, не патрабавала аліменты. Проста ўзяла два свае чамаданы і пераехала жыць да бацькоў. Паша, відаць, ацаніў, што ў мяне не было ніякіх карысных намераў. Зараз у нас выдатныя адносіны. Больш за тое, калі развяліся, усе супярэчнасці зніклі, наадварот — стала значна прасцей кантактаваць. Я стараюся па магчымасці зусім не канфліктаваць з людзьмі. Для гэтага ніякіх асобых талентаў мець не трэба. Проста варта больш размаўляць.

**Ала Віктараўна:** Што цікава, цяперашні муж Тані *(Ала Віктараўна з усмешкай пазірае на Аляксея)* — вучань нашага першага зяця. У іх таксама зараз добрыя адносіны.

**Таццяна:** Лёша нават быў у майго былога мужа на вяселлі, дапамагаў вазіць гасцей. Паша зусім нядаўна ажаніўся. Нас усіх — і маіх бацькоў, і мяне з сынам — таксама запрашаў на вяселле.

**А. В.:** Лёшу мы ведаем з 6 гадоў. Тады ён прыйшоў у школу, дзе мы працуем, у першы клас. На флейце вучыўся іграць. Мы заўсёды ставіліся да яго з сімпатыяй, але і падумаць не маглі, што ён стане нашым зяцем.

**Таццяна:** А з татам Уладзіка мы працягваем разам іграць у «BREVISe». Нават на гастролі муж адпускаў мяне на два тыдні. У нас з Лёшам вельмі адкрытыя адносіны, даверлівыя, мы ніколі не падманваем адно аднаго, нават у дробязях. Ды і я не даю ніякіх падстаў, каб мне не давяраць.

***— Віктар Сцяпанавіч, наколькі я ведаю не так даўно цяперашні зяць зрабіў вам незвычайны падарунак...***

**В. С.:** Так *(пагладзіў па галаве ўнука)*, Дамір таксама, як і я, Тульвінскі. Я быў на сёмым небе ад шчасця, калі даведаўся, што бацькі вырашылі даць свайму сыну прозвішча дзеда. Нават і ўявіць сабе такога не мог.

## «Можна Віктара Сцяпанавіча?» — «А каторага?..»

***— Ала Віктараўна, Віктар Сцяпанавіч, вы не толькі жывяце разам ды гастралюеце, але яшчэ і працуеце ў адной школе ўжо больш за 30 гадоў. Хоць на дзень разлучаліся?***

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**В. С.:** Нават на тыдзень. Нядаўна я браў адпачынак, каб паспець да зімы разабрацца на лецішчы з дахам. Сям'я ж расце, вырашылі расшырацца.

**А. В.:** Але ўсё адно нам складана адно без аднаго. Стэлефаноўваліся як мінімум два разы на дзень. Ранкам, каб запытацца «Як спалася?». Увечары, каб падзяліцца навінамі за дзень і пажадаць спакойнай ночы.

**В. С.:** Рэдка мы расстаёмся. Практычна заўсёды разам. І на працы, і дома, і ў адпачынку.

**А. В.:** Бывае, пра нешта падумаю і дзялюся з мужам. А Віця: «Слухай, проста з языка зняла, у мяне якраз гэта думка ў галаве».

**Таццяна:** Бацькі неразлучныя, бо аднадумцы. 4 студзеня, дарэчы, будзе 42 гады, як яны разам.

**В. С.:** Ёсць на каго раўняцца — бацькі Алы больш як 60 гадоў разам пражылі.

**А. В.:** У нас перад вачыма заўсёды быў прыгожы прыклад адносін паміж мужчынам і жанчынай.

***— Псіхолагі раяць маладым жыць асобна ад бацькоў. Вы ж, наколькі ведаю, усё жыццё жылі з імі ў адной кватэры. І пры гэтым захавалі цудоўныя адносіны. Як умудрыліся ні разу не пасварыцца?***

**В. С.:** А як мы будзем сварыцца, калі бацькі за сценкай? Мы маглі толькі шэптам гэта рабіць *(смяецца)*.



**Дамір пакуль б'е ў бубен ды з цікавасцю націскае на кнопкі акардэона. «Ён яшчэ не ведае, што яго чакае, — смяецца Віктар Сцяпанавіч. — Мама неўзабаве хоча аддаць яго вучыцца іграць на піяніна».**

А праз пяць хвілін запал патух, ужо і сварыцца не хочацца.

**А. В.:** Мама ў мяне аднойчы запыталася: «Дачушка, а вы наогул сварыцеся з Віцем ці не?» — «Часам бывае», — кажу. «А як вы гэта робіце? Я ж не бачу нічога і не чую».

**В. С.:** Разумелі, што калі пачнём сварыцца, нават з-за дробязі, бацькі будуць перажываць. Мы ж іх вельмі паважалі, таму стараліся максімальна аберагаць.

***— Але ж як ужываліся дзве гаспадыні (а дочкі падраслі, дык і ўсе чатыры) на адной маленькай кухні?***

**В. С.:** Мама Алы была вялікім дыпламатам. Яна ўмела разруліць любую сітуацыю так, каб усім было добра.

**А. В.:** Калі мы прыходзілі дадому, бацькі цалкам вызвалялі нам кухню. Не было эгаізму. Кожны ў першую чаргу думаў пра роднага і блізкага чалавека, як будзе лепш яму. Ведаю, што ў некаторых сем'ях жывуць па правіле: «Я хачу зараз прыняць ванну, а вы пачакайце». Не, такога ў нас ніколі не было.

***— Ала Віктараўна, як адрэагаваў тата, калі даведаўся, што вашага абранніка таксама завуць Віктар Сцяпанавіч?***

**А. В.:** Яму было вельмі прыемна. «О, — кажа. — Цяпер нас двое». Калі мы пажаніліся, не было мабільных тэлефонаў, усе званілі толькі па дамашнім. Знаёмыя і сваякі ведалі, што ў нас два Віктары Сцяпанавічы. Таму, калі тэлефанавалі, прасілі паклікаць Віктара Сцяпанавіча малодшага альбо старэйшага. А тыя, хто не ведаў, траплялі ў камічную сітуацыю: «Можна Віктара Сцяпанавіча?» — «А каторага?» — «А ў вас што, двое?»

## «Дачушка, у мяне свёкар быў гадкі-гадкі, але ж свякроўка — залатая...»

***— Віктар Сцяпанавіч, як вы пазнаёміліся са сваёй жонкай?***

**В. С.:** Было гэта ў музычным вучылішчы, у Наваполацку. Ала вучылася на першым курсе, я — на чацвёртым. Мы як мінімум 4—5 гадзін у дзень павінны былі займацца на інструменце. Хтосьці гэта рабіў у прыбіральні, хтосьці на лесвічнай пляцоўцы. Дык вось сяджу я на прыступках, іграю... А зверху ўніз студэнты ходзяць. Спачатку ногі відаць і толькі потым — чалавек. І тут раз — штосьці такое прыгожае выплывае... Боты-панчохі тады толькі ў моду ўвайшлі. Ала ж сталічная дзяўчына, мама прыбірала. Вось і запала ў душу. Як цяпер памятаю, калі яна спускалася ў гэтых боціках па лесвіцы з трэцяга паверха, я вачэй не мог адвесці.

**А. В.:** Мы жылі ў адным інтэрнаце. Да мяне старшакурсніцы прыбягаюць і кажуць: «Хлопец з табой хоча пазнаёміцца. Ты згаджайся. Ён вельмі добра нямецкую мову ведае. Возьмеш яго канспекты». Віця пасля сапраўды дапамагаў мне перакладаць тэксты. Але той разлік вельмі хутка перарос у сапраўднае каханне.

**В. С.:** Мы рана пажаніліся. Мне было 19, Але — 17. У той год пабраліся шлюбам яшчэ пяць маіх аднакурснікаў. Але толькі аднаму мне пашанцавала. Студэнцкія сем'і знаёмых развaліліся.

***— Уявіце, каб у той час, калі вы жылі з бацькамі, вам сказалі: «Даём кожнаму па асобнай вялікай кватэры, але забіраем усе музычныя інструменты». Прамянялі б музыку на асобнае жыллё?***

**В. С.:** У нас быў падобны выбар на пачатку 90-х. Настаўнікам музыкі тады плацілі ўсяго 20 долараў у месяц. І большасць нашых калег падаліся ў «чаўнакі». У нас таксама стаяла дылема: працягваць бясплатна працаваць дзеля ідэі ці ісці зарабляць грошы. Як бачыш, засталіся, не кінулі. Цяжкі быў перыяд. Калі ў кагосьці муж добра зарабляў, то жонцы можна было працаваць за ідэю. А ў нас жа ўсе ў адным чоўне: я, Ала, дачка з зяцем. Але пратрымаліся. І цяпер ні кроплі не шкадуем. Бо займацца ўсё жыццё нелюбімай справай — не цукар. Калі «ну, не тваё гэта», тады і грошы тыя будуць нямілыя.

**А. В.:** Затое дзякуючы «Першацвету» мы аб'ехалі практычна ўсю Еўропу.

**В. С.:** Цымбалы ж для іншаземцаў экзотыка. Яны такога нідзе не бачылі. У Францыі нас нават запрасілі іграць на заручынах бургундскай прынцэсы, яна выходзіла замуж за арабскага шэйха. Гэта былі незабыўныя ўражанні.

***— Што ў вас асацыюецца са словам «сям'я»?***

**Таццяна:** Узаемападтрымка.. У нашай сям'і, як у «Трох мушкецёрах», адзін за ўсіх і ўсе за аднаго.

**В. С.:** Ну так, калі камусьці патрэбна дапамога, усё кідаеш і ляціш. У тым ліку і па працы бываюць розныя сітуацыі. Напрыклад, акардэаніст захварэў, а праз гадзіну канцэрт. Я ведаю, што заўсёды магу папрасіць дачку, каб падстрахавала. Тое ж самае датычыцца і зяця, Лёша з намі на ўсіх канцэртах. Ён не толькі іграе на флейце, але і інструменты дапаможа разгрузіць. Для працы гэта добра. Выніковасць зусім іншая, калі ва ўсіх ёсць інтарэс падтрымаць адно аднаго.

*(Увесь вечар Аляксей жартаваў, расказваў анекдоты.)*

***— Вам з зяцем, гляджу, сумаваць не даводзіцца?***

**А. В.:** Нам з мужам пашанцавала, абодва зяці з пачуццём гумару. Калі яны разам збіраюцца, смяюся да слёз...

**В. С.:** Наша малодшая дачка Юля, як і Ала, іграе на цымбалах. Яна выйшла замуж у Літву. Дарэчы, сустрэла сваё каханне на маёй малой радзіме, у Лынтупах. Бабуля зяця і мая маці суседкамі былі. Хоць муж Юлі і не музыка, але папрасіў мяне навучыць яго іграць на гітары. Інструмент я яму ўжо падарыў. Іграць таксама даўно навучыў бы, каб крыху бліжэй жылі *(смяецца)*.

**А. В.:** Мы з Віцем стараемся не ўмешвацца ў адносіны дзяцей. Як я кажу, добра маім дочкам, дык мне ў тысячу разоў лепш. Застаецца толькі радавацца і маліцца за іх шчасце і здароўе. У мяне і мама ніколі не лезла ў нашы з мужам адносіны. І свякроў, барані божа. Яна толькі магла спытаць: «Дзетка, а ці добры мой Віцечка муж?» «Добры», — смяюся. «Калі ж, можа, трошку нешта не тое, дык ты кажы. Я пагавару з ім». Для яе самае галоўнае было, каб усё ў нас ішло добра. Не ўносіла абсалютна ніякай смуты. «Дачушка, у мяне свёкар быў гадкі-гадкі, але ж свякроўка — залатая. Можа, і я такая...». З ёй было так цікава размаўляць. Мы як прыязджалі, яна заўсёды казала: «Дачушка, кладзіся ты са мной спаць, пагаворым з табой да раніцы». Яна штосьці пытаецца, я расказваю. У мяне з мамай былі цудоўныя адносіны.

***— Вы называлі свякроў мамай?***

**А. В.:** Так. І яна мяне ніколі Алай не звала. Калі цябе называюць «дачушка», ты ж не скажаш «Леанора Паўлаўна». Я спачатку звярталася да свекрыві «мама», а потым — «мамачка». Мне было лёгка так яе называць. Нават не стаяла пытанне неяк па-іншаму. Ды і жанчыне прасцей сказаць «мама». Хоць Віця маіх бацькоў таксама называў мамай ды татам.

**В. С.:** Як называць, гэта не самае галоўнае. Галоўнае, каб дзеці любілі сваіх бацькоў і клапаціліся пра іх.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
nadzieja@zviazda.by

■ Далучайцеся!

# МАМСКІЯ ТАНЦЫ

## На занятку можна прыходзіць з дзеткамі



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Чым займаюцца сучасныя матулі? Расказваюць казкі, спяваюць калыханкі, гатуюць самыя смачныя стравы, лепяць, малююць, выразаюць і пры гэтым паспяваюць хадзіць на лекцыі, выстаўкі і... танцаваць. Менавіта дзеля таго, каб у Мінску з'явілася яшчэ больш месцаў, дзе маці можа творча рэалізавацца, застаючыся побач з дзіцем, Таццяна ШЧУКО запусціла марафон #мамскіятанцы.**

### Эмацыянальнае аздараўленне і магчымасць адчуць сябе прыгожай

— Сама я танцаваць пачала вельмі рана. Напэўна, як толькі навучылася хадзіць, — смяецца Таццяна. — А дзесьці ў пяць гадоў маці аддала мяне на бальныя танцы. Было шмат выступленняў, у тым ліку за мяжой. Потым паступіла вучыцца, трапіла на летнюю практыку да салі스ткі шоу-балета TODES у Маскве, шмат працавала. А дзесяць гадоў таму з'явіўся мой уласны танцавальны праект, якім я сапраўды ганаруся, — RADICALFASHION.

Калі ў Таццяны нарадзілася дачка Варвара, яна не разлучалася з ёй нідзе, нават на рэпетыцыях. Але аднойчы сутыкнулася з тым, што Мінск прапаноўвае не так многа актыўнасцяў для мам з дзецьмі. Хочаш разівацца — пакідай дзіця дома.

— Захацелася стварыць нешта самой. Так і з'явіліся #мамскіятанцы. Гэта, можна сказаць, сацыяльны праект. Марафон для ўдзельніц быў зусім бясплатны. За месяц мы развучылі нумар, а напрыканцы запрасілі аператара, які зняў наша выпускное выступленне.

Шчыра кажучы, я не думала, што будзе такі водгук. Хацелася набраць 10 чалавек, а ў выніку на першых занятках было 20 мамачак.

Спачатку да марафону далучыліся жанчыны, якія, як і я, наведваюць сямейны цэнтр Юліі Гусакоўскай-Старавойтавай, а потым мяне па хэштэгу пачалі знаходзіць і тыя, з кім не была асабіста знаёмая.

— Я даўно марыла танцаваць, — успамінае **адна з удзельніц марафону #мамскіятанцы Юлія ПАПОВА,** — але ніяк не магла знайсці такое месца, дзе на занятКі можна было б хадзіць з дзецьмі. Калі пазнаёмілася з Таняй, пачала ўпрошваць яе зладзіць такі праект.

Тут цудоўная атмасфера, ёсць магчымасць праявіць сабе творча, разняволіцца, што сапраўды вельмі важна для мам. Для мяне гэта нейкае эмацыянальнае аздараўленне. Ну і, вядома, гэта магчымасць зноў адчуць сабе прыгожай жанчынай: цягнуць насок, трымаць роўна спіну. А на выпускное выступленне мы запрасілі сваіх мужоў. Каб яны маглі палюбавацца намі на сцэне!

### Сацыялізацыя для дзяцей

Пакуль матулі танцуюць, дзеці займаюцца кожны сваёй справай, якіх, сапраўды, у зале можна знайсці шмат: пабегаць адно за адным, выкацiць вялікія шары для ёгі, дапамагчы некаму з'есці цукерку, паплакаць і нават паспаць.

— Безумоўна, — прызнаецца Таццяна, — часам даводзіцца адхіляцца ад заняткаў, каб супакоіць дзіця, пакарміць. Я, бывае, танцую, трымаючы дачку на руках.

Дарэчы, я не стаўлю абмежаванняў па ўзросце дзяцей, якія могуць прыходзіць з мамамі. Мамы маюць права вырашаць гэта самі. Хтосьці піша мне, што малому толькі два месяцы, таму прыйдзе пазней. Але, напрыклад, я лічу, што гэта даволі зручны ўзрост, каб куды-небудзь хадзіць разам. Калі Варвары было столькі ж, я брала яе і ішла на лекцыі па мастацтве, падчас якіх яна спала.

Бывае і так, што, калі з дзіцем нікуды амаль не выходзіш, яно прывыкае да цішыні і спакою, і потым яму складаней сацыялізавацца сярод людзей і розных гукаў.

Акрамя таго, дзеці бачаць сваіх актыўных мам і з часам будуць старацца быць падобнымі да іх.

Такога ж меркавання прытрымліваецца і яшчэ адна **ўдзельніца марафону Таццяна ТАРАСАВА:**

— Я лічу, што гэты праект карысны не толькі для маці, якая тут атрымлівае фізічную нагрузку і нават у нейкім сэнсе адпачывае. Гэта таксама вельмі важна для дзяцей, якія камунікуюць паміж сабой, маюць зносіны з іншымі дарослымі, не толькі са сваімі мамай і татам.

У свой час да праекта далучаліся і шматдзетныя матулі. А калі-нікалі паглядзець на рэпетыцыі заглядваюць і таты.

— Аднойчы, — успамінае **Таццяна ШЧУКО,** — мой муж прысутнічаў на нашым занятку. І так атрымалася, што прыйшло сапраўды вельмі шмат мам з дзецьмі. Тады ён быў у шоку: як сярод усіх гэтых гукаў і крыкаў мы можам спакойна займацца.

### Па-за марафонам

Цяпер марафон завяршыўся і пачаліся заняткі ў пастаянных танцавальных групах. Але Таццяна абяцае: праз нейкі час ён абавязкова паўторыцца.

— Ведаеце, цікава тое, што нашы зносіны працягваюцца за межамі танцавальнай залы. І я сапраўды вельмі перажываю за гэта. Так у нас паступова з'яўляецца клуб актыўных сучасных матуль.

Пачыналася ўсё ў сацыяльнай сетцы, дзе я дзялілася навінамі аб марафоне, ладзіла апытанні, конкурсы, каб бліжэй пазнаёміцца з удзельніцамі. А цяпер мы збіраемся разам, каб проста пагутарыць, весела і карысна правесці час. Аднойчы адна з матуль, яна вельмі добры кандытар, спякла для нас смачныя пачастункі і мы засталіся пасля рэпетыцыі піць гарбату. А калі было сонечна і цёпла, зладзілі пікнік: давучвалі танцавальную праграму проста на прыродзе!

**Ганна БАГІНО.** bahino@zviazda.by

# ЖЫРАФА ПА МЯНУШЦЫ МАКАРОНА



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

У школе дзеці вучацца асновам кінадраматургіі, напісанню сцэнарыяў. Асвойваюць розныя тэхнікі мультыплікацыі: папяровае перакладанне (так здымаўся «Вожык у тумане»), пластылінавую анімацыю, сыпучую (выкарыстоўваюць пясок, грэчку, манную крупу). Самая працаёмкая тэхніка — маляваная. Па стандарце павінна быць 25 кадраў у секунду, але дзеці робяць лягчэйшы варыянт — у сярэднім 8—12 кадраў.

— Хлопчыкі любяць яшчэ лега-анімацыю, але мне канструктар не вельмі падабаецца: можна зняць толькі экшэн, а эмоцыі на твары не пакажаш, — заўважае кіраўнік студыі.

***— А камп'ютарнай графіцы вучыце?***

— Не, гэта больш падыдзе старэйшым дзецям. А ў малодшым узросце (у нас займаюцца з трох гадоў) лепш пачынаць з прыкладной анімацыі, бо вельмі важныя тактыльныя адчуванні. Тут кожны персанаж памятае цяпло дзіцячых рук, перадаецца энергетыка. Камп'ютарныя героі, на маю думку, усё ж больш сухія.

Калі створаныя персанажы і дэкарацыі знятыя, пачынаецца мантаж і агучванне. Усё па максімуме робіць сама малеча. «Педагогі выключна дапамагаюць. Дарослыя, мне здаецца, толькі псуюць дзіцячую творчасць сваім поглядам», — усміхаецца Наталля.

Летась, дарэчы, групавы мульцік навучэнцаў студыі — «Кляксандыя» — быў паказаны на міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў «Анімаёўка» і атрымаў у сваёй узроставай намінацыі ўзнагароду — «Хрустальны аловак». А сёлета на гэтым жа конкурсе іх карціну «Гузікі» прызналі найлепшым дзіцячым анімацыйным фільмам.

### ПРЭМ'ЕРЫ ДЛЯ ЎСЁЙ СЯМ'І

У студыі якраз ідуць заняткі. Дзяўчаткі 3—5 класаў натхнёна малююць прыдуманых персанажаў. На прыход журналіста не звяртаюць ніякай увагі: паглыблены ў творчы працэс.

Сюжэты ў юных аніматараў даволі цікавыя. Віка, напрыклад, стварыла гісторыю пра жырафу Макарону. Яна была вельмі высокай, бачыла месяц, зоркі, вясёлку, але астатнія жывёлы ёй не верылі. Пакуль сонейка не паказалася з-за аблокаў і не прайшоў дождж. Тады ўсе зразумелі, што жырафа мела рацыю, і сталі з ёй сябраваць.

***— А чаму ў жырафы такое імя дзіўнае?***

— Бо яна жоўтая, як макарона, — з усмешкай адказвае Віка.

З дакладам пра мультыплікацыю дзяўчынка выступала нават на школьнай канферэнцыі. Заняла другое месца і ў якасці бонуса атрымала сертыфікат на 10 балаў, які можна прымяніць на любым прадмеце.



А яшчэ кажуць, што мульцікі вучобе перашкаджаюць!

Вера мінулы раз рабіла міні-фільм у тэхніцы папяровага перакладання, расказвала пра краіну, дзе ўсё было шэрае, галоўнай слабутасцю лічылася дрэва без лісця. А яе суседка Рамана любіць ляпіць персанажаў з пластыліну. На паказ сваіх новых мульцікаў збірае ўсю сям'ю: маму, тату, брата, сястру.

***— Кветкі на прэм'еры табе дораць?***

— Не, — смяецца. — Проста кажуць, што я малайчына і што будуць чакаць новых мульцікаў.

Самыя папулярныя персанажы ў дзяцей — супергероі (у хлопчыкаў) і феі (у дзяўчатак). Летась героямі анімацыі былі нават бонсты. Здымаючы свае ўласныя кінакарціны, малыя становяцца больш назіральнымі: вучацца заўважаць цікавыя дэталі ў паўсядзённым жыцці.

На групавы анімацыйны фільм, які ствараюць 4—5 чалавек, у навучэнцаў ідзе два месяцы (тут галоўнае — размеркаваць абавязкі: усе ж хочуць маляваць галоўнага персанажа). Аўтарскія рыхтуюцца не менш чым за тры месяцы. «Мульцікі ў нас кароткія: ад хвіліны да трох, — тлумачыць Наталля Кулібава. — Дзеці ў малодшым узросце не здольныя на працяглую работу — ім хочацца хутчэй убачыць вынік. Я іх супакойваю тым, што «Галаваломка» здымалася чатыры гады, хоць над яе стварэннем працавала тысяча чалавек».

### РАЗРАДКА... ПРАЗ СЮЖЭТ

Праз мульцікі бацькі даведваюцца новае пра сваіх дзяцей. Бо персанажы, якіх стварае малеча, — праекцыя іх унутранага свету. Калі герой сумны, то, напэўна, і дзіця нешта турбуе. Праз сюжэт яно вырашае свае ўнутраныя канфлікты — такая своеасаблівая разрадка. Да таго ж педагогі дадаюць у праграму практыкаванні, якія носяць дыягнастычны характар.

— У кожным дзіцячым мульціку можна знайсці глыбокую думку, — упэўнена кіраўнік студыі. — Неяк малеча прыдумала сюжэт пра папулярную камп'ютарную гульню «Майнкрафт». Сутнасць такая: хлопчык загуляўся і трапіў у віртуальны свет. Глядзіць: а ён стаў квадратным, тата з мамай таксама квадратныя. Потым аказалася, што гэта ўсяго толькі сон. Але хлопчык стаў больш цаніць жыццёвыя моманты: пачаў ганяць мяч з сябрамі, кнігамі зацікавіўся.

***— Калі бацькі аддаюць дзіця на айці-курсы, яны спадзяюцца, што з яго вырасце добры праграміст. Такі зачын на будучыню. Анімацыя ж развівае найперш фантазію. Якое ж практычнае прымяненне ў дарослым жыцці?***

— Фантазія ратуе нас і дае сілы спраўляцца з цяжкасцямі, — лічыць Наталля Кулібава. — Без яе чалавек становіцца робатам, які рухаецца па маршруце «дом — работа — дом», а сапраўдныя радасці праходзяць міма. Калі творча ставішся да жыцця, тады яно набывае сэнс. Гэта як чорна-белая размалёўка: калі яе не запоўніць яркімі фарбамі, яна так і застанецца пустой.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** lubneuskaya@zviazda.by

## Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

**Таблица № 1**

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% | № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автопогрузчик с инв. №6 | 3 996,00 | 2 | Автопогрузчик вилочный б/у г/п 2 тн FG20 (Митсубиси) с инв. №211 | 18 036,00 |
| В отношении имущества, указанного в таблице №1, проводятся первые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 28.10.2017 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 10%. Окончание приема заявлений в 16.00 07.12.2017 | | | | | |

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **11 декабря 2017 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122 |
| Шаг аукциона | 5% |
| Задаток | 10% от начальной стоимости предмета торгов |

**Таблица № 2**

| № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% | № п/п Лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Утеплитель multi 40 мм (1,2х0,58; толщ. 40, 576 шт.) | 2 937,60 | 4 | Утеплитель instal 50 мм (1,2х0,58; толщ. 50, 605 шт.) | 4 290,66 |
| 2 | Утеплитель flex 80 мм (1,2х0,6; толщ. 80, 493 шт.) | 5 152,84 | 5 | Утеплитель top 20 мм (1,2х1,2; толщ. 20, 476 шт.) | 3 250,13 |
| 3 | Утеплитель ultra 60 мм (1,25х0,58; толщ. 60, 633 шт.) | 6 016,03 | | | |
| Торги в отношении имущества, указанного в Таблице №2, проводятся впервые. Окончание приема заявлений в 16.00 08.01.2018 г. | | | | | |

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения торгов | **10 января 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122 |
| Шаг аукциона | 5% |
| Задаток | 10% от начальной стоимости предмета торгов |
| Организатор торгов | ООО «Фрондера», +375 29 339 68 45 |
| Информация о продавце | Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», г. Минск, ул. Селицкого, д. 39 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122) |
| Условия для участия в торгах | До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 код банка ALFABY2X УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах, назначенных на __.__.2017, по Лоту №__.<br>Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah<br>Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях после возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету) в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.<br>В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| | |
|---|---|
| **Извещение о проведении аукциона** | |
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «Белстройцентр», г. Минск, ул. Р. Люксембург, 101, тел. (017) 208 78 32 |

**Предмет аукциона**

| Инв. № | Наименование | Начальная цена с НДС 20% | Месторасположение |
|---|---|---|---|
| 725 | **Грузовой специальный автобетононасоса 58153С на базе шасси КамАЗ 6540-62, 2008 г.** | 215 040,00 бел. руб. | г. Минск, ул. Казинца, 24а |

